Бальшавікі Беларусі—у авангард барацьбы за высокі ўраджай!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 13 1932 г. № 229 (4481)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АБ ХОДЗЕ АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ — Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б (1 стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Ліквідаваць запазычанасьць — баявая задача папяровай прамысловасьці. Да вынікаў XII пленуму ВККІ (3 стар.). В. С. — Палепшыць зьмест работы вясковай ячэйкі (2 стар.).

Бязьлітасны адпор ворагам Ленінскай партыі (2 стар.).

Пастанова ЦКК УсеКП(б) ад 9 кастрычніка 1932 году (2 стар.).

Падхапіць пачын калгасу імя Пакроўскага, практычна рэалізаваць пастанову ЦК і СНК (1 стар.).

Больш тавараў шырспажыву добрай якасьці (3 стар.).

Бульбу з поля на адгрузачныя пункты (3 стар.).

Рапартамі перамог сустрэць XV гадавіну Кастрычніка (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Перадвыбарчая барацьба ў Бэрліне (4 ст.).

Адстаўка румынскага прэм'ера (4 стар.).

ЛІКВІДАВАЦЬ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ—БАЯВАЯ ЗАДАЧА ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Рабочая кляса Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам партыі на чале з выпрабаваным лепшым т. Сталіным, атрымала вялікія перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Растуць новыя фабрыкі і заводы, зьмяняецца выгляд старых прадпрыемстваў.

БССР — у мінулым адсталая акраіна царскай Расіі **«робіцца краінай разьвітай прамысловасьці... БССР увяла ўсеагульнае пачатковае навучаньне»** (XIV зьезд КП(б)Б).

На аснове індустрыялізацыі краіны, рэканструкцыі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі пышная расьце культура, нацыянальная па форме, сацыялістычная па зьместу. Пабудаваны **32 ВНУ, 130** тэхнікумаў, у якіх навучаецца звыш **48 тыс.** рабочых і працоўных сялян. Апрача гэтага, мы маем тысячы нізэйшых пачатковых і вячэрніх рабочых, саўгасна - калгасных школ. Шпарка разьвіваецца кнігавыдавецкая справа. Са дня ў дзень расьце колькасьць і тыраж часопісяў і газэт. **Ужо зараз у БССР выпускаецца газэт: раённых 71, шматтыражак звыш 100, цэнтральных — 14 і інш.**

Перад папяровай прамысловасьцю пастаўлена адказнейшая задача забясьпечыць поўнасьцю і ў тэрмін усе патрэбы навучальныя, культурныя і інш. установы паперай добрай якасьці.

У справе выпуску паперы мы значна абагналі даваенную Беларусь. **Калі ў 1913 годзе 15 папяровых капіталістычных прадпрыемстваў выпускалі 21.300 тон, ДЫК 7 СУЧАСНЫХ САВЕЦКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ павінны даць у 1932 годзе 57 тыс. тон паперы — больш як у 2,5 раз.**

У апошнія гады праведзена карэнная рэканструкцыя фабрык на падставе навейшай тэхнікі. На шклоўскай фабрыцы «Спартак» устаноўлен нямецкай фірмы «Фойта» дэфіброр, магутнасьцю ў 10 тон масы за зьмену. Такі-ж дэфіброр устаноўлен і на фабрыцы «Герой працы».

Папяровая прамысловасьць ня толькі БССР, але і ўсяго Савецкага саюзу да вайны карысталася прывозным сырцом з-за межаў. Зараз гэта выробляецца ў нашай краіне.

У мэтах патаньеньня кошту сырцу перад прамысловасьцю БССР зараз стаіць задача максымальна скараціць завоз яго з саюзных рэспублік і стварыць сваю сырцовую базу. **У 1932 годзе нашы папяровыя прадпрыемствы павінны атрымаць 6.291 тону дрэвамасы і 9 тыс. тон цэлюлёзы, загатоўленай у кас на месцы. Новы саломена-цэлюлёзны завод у Добрушы, пабудаваны паводле апошняга слова тэхнікі, дасьць дадаткова 200 тон цэлюлёзы ў зьмену.**

У справе забясьпячэньня папяровых фабрык апалам мы дабіліся вялізарных посьпехаў. Замест каменнага вугалю, які завозіўся ў БССР, — нашы фабрыкі пераведзены на мясцовы апал — торф.

Пабудаваны і мэханізаваны падвесны шлях ад торфазаводу «Шлях сацыялізму» да папяровай фабрыкі «Герой працы», магутнасьцю ў 500 тон торфу за зьмену, забясьпечвае поўнасьцю фабрыку апалам.

Новая сілавая станцыя гэтай-жа фабрыкі па сваёй магутнасьці можа ня толькі даць пара-энэргію для бесьперабойнай работы яе, але і электрыфікаваць ваколічныя саўгасы і калгасы. Значна палепшылася матар'яльна-бытавое абслугоўваньне рабочае клясы.

Усе гэтыя факты даюць поўную магчымасьць папяровай прамысловасьці ня толькі выканаць, але і перавыканаць вызначаныя партыяй і ўрадам пляны.

Аднак, ня гледзячы на ўсе магчымасьці, папяровая прамысловасьць за апошні год працуе са значнымі прарывамі. Вытворчая праграма па выпуску паперы за 9 месяцаў 1932 г. выканана ўсяго на 54 проц. Выпушчана, параўнальна з адпаведным пэрыядам мінулага году, паперы менш на 12,9 проц. Гэта азначае, што за 9 месяцаў недадана краіне звыш 18,9 тыс. тон паперы.

Прадукцыйнасьць працы, замест запраектаванага росту паводле пляну на 48,9 проц., зьнізілася на 30 проц. Гэта тлумачыцца відавочна тым, што многія арганізацыі папяровай прамысловасьці забылі ўказаньні Леніна, што **«прадукцыйнасьць працы, гэта ў канчатковым выніку самае важнае, самае галоўнае для новага грамадзкага ладу».**

Галоўнымі прычынамі ганебнага адставаньня папяровай прамысловасьці зьяўляюцца адсутнасьць **канкрэтнага кіраўніцтва з боку трэсту фабрыкамі і фабрычных арганізацый нізавымі вытворчымі зьвенямі.**

Партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі ў большасьці сваёй ізмкнуцца апраўдаць прарыў адсутнасьцю апалу і сырцу. Між тым, яны нічога ня робяць для таго, каб наладзіць своячасовую транспартыроўку торфу на прадпрыемствы. Не скарыстаны і тыя магчымасьці, якія забясьпечылі-б фабрыкі сырцом.

На складах «Белпаперуцілю» ляжыць каля 5 вагонаў макулатуры. Загадчык канторы тав. **Кавалёў** апраўдвае гэта становішча недахватам рабочай сілы. Ён чакае, што рабочыя да яго прыдуць у парадку самацёку.

Не аддаецца належнай увагі і пытаньням арганізацыі працы. Кіраўніцтва фабрык ня ўсё зрабіла для таго, каб правільна **«расставіць сілы, каб кожная група рабочых адказвала за работу, за мэханізм, за варштаты, за якасьць працы»** (Сталін).

Гэта ўказаньне правадыра партыі яшчэ не знайшло свайго практычнага праламленьня ў рабоце папяровай прамысловасьці. Адсутнасьць правільнай расстаноўкі рабочых, барацьбы за зьнішчэньне пэхавых перападак прывялі да таго, што рад фабрык працуюць з нянёўнай нагрузкай. Абязьліч ка моцна трымаецца на папяровых фабрыках.

Пастачовы XVII партыйнай канфэрэнцыі, Наркамцяжпраму і УсеЦСПС аб тэхнічным нармаваньні не знайшлі свайго практычнага праламленьня ў папяровай прамысловасьці.

Гэта з усёй відавочнасьцю паказваюць лічбы. Толькі **58,9 проц.** усяго складу рабочых папяровай прамысловасьці атрымалі больш-менш тэхнічна абгрунтаваныя нормы.

Дырэктар па працы фабрыкі «Герой працы» тав. **Гутараў** займаецца чым хочаце, але не тэхнарманраваньнем, адсюль, як вынік, сетачнік (вышэйшая кваліфікацыя) зарабляе **3-4** руб у зьмену, а дапаможны рабочы — **5 руб. 95 кап.** Каваль абганяе ўсіх, ён зарабляе **ад 9 да 12 руб.** у зьмену. Аналёгічнае становішча мы маем і на фабрыках **«Чырвоная зорка», «Спартак», Прафінтэрн»** і інш.

Папертрэст у справе наладжваньня работы фабрычных ТНБ нічога ня робіць. Наадварот, трэст перакідвае тэхніка-нармірэўшчыка тав. **Лубяка**, інжынэра **Шэйдэрмана, Катлярскага** на работы не па спэцыяльнасьці. Ва ўсёй папяровай прамысловасьці па пытаньнях тэхнарманраваньня працуе толькі адзін інжынэр **Майданскі.**

На фабрыках імя **Сталіна**, імя **Леніна**, імя **Вароўскага, «Прафінтэрн»** толькі зараз узяліся за арганізацыю ТНБ. Нормы-ж пакуль што ўстанаўляюцца адміністратарамі і майстрамі на вока.

Усё гэта прывяло да таго, што фонд зарплаты за 9 месяцаў бягучага году выдатковалі на 108 проц., пры выкананьні вытворчай праграмы на 54 проц.

Ня лепшае становішча мы маем і ў пытаньнях рацыяналізацыі вытворчасьці. Паводле слоў загадчыка БРЫЗ'у трэсту т. **Тарасенка**, лік рабочых прапаноў з месяца ў месяц памяншаецца амаль **на 20 проц.** За 8 месяцаў паступіла **577 прапаноў**, а рэалізавана толькі **221.** На фабрыцы «Герой працы» прапанова т. Пранузінкі, аб скарыстаньні адсечкі масы - (што дае эканоміі **19 тыс.** руб. у год) на працягу 6 месяцаў марнуецца ў папках дырэкцыі. Прапанова аб устаноўцы разрэзнага нажа на машынах **№ 5 і 6,** што зьмяншае брак паперы і дае эканоміі каля **15 тыс.** руб. у год, таксама не ажыцьцёўлена.

Сабекошт замест зьніжэньня да **6,1 проц.** павялічыўся да **22,4.** Гэта зьяўляецца вынікам апартуністычнай недаацэнкі галоўнейшай крыніцы сацыялістычнага накапленьня на справу індустрыялізацыі.

Барацьба за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня яшчэ не заняла цэнтральнага месца ў рабоце фабрычных арганізацый папяровай прамысловасьці. Прадукты гніюць у прыгарадных гаспадарках (Добруш, Шклоў, Чашнікі, Барысаў), а на прадпрыемствах на першае падаюць суп з пэрловых круп, на другое кашу... з гэтых-жа круп.

Абвешчаны конкурс Наркамлесам па практычным ажыцьцяўленьні 6 умоў тав. Сталіна яшчэ ня стаў мэтадам упартай барацьбы за выкананьне прамфінпляну. Асобныя арганізацыі фабрык дагэтуль займаюцца абяцаньнямі і практычна нічога ня робяць па мабілізацыі партыйцаў, камсамольцаў, лепшых ударнікаў на барацьбу за плян.

Папяровая прамысловасьць **мае ўсе** магчымасьці для бесьперабойнай **работы.** Партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны мабілізаваць для таго, каб заваяваць права рапартаваць XV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі аб поўным выкананьні вызначанага партыяй і ўрадам пляну.

АБ ХОДЗЕ АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР І ЦК КП(б)Б

Адзначаючы зусім нездавальняючы ход капаньня, загатоўкі і адгрузкі бульбы Ленінграду (па становішчу на 9.X — адгружана ўсяго 23 проц.), што ставіць пад пагрозу выкананьне пляну адгрузкі бульбы, СНК і ЦК КП(б)Б **ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:**

1. Для фарсаваньня і скончэньня капаньня, загатоўкі і адгрузкі бульбы Ленінграду ў вызначаны тэрмін — да 1 лістапада 1932 г. стварыць пры СНК БССР аперацыйную «шасьцёрку» СНК і ЦК у складзе т. т. Бэнэка, Рыскіна, Балціна, Закоўскага, Хаскіна і Галадзеда, а ў раёнах — «тройкі» ў складзе: сакратара РК КП(б)Б, старшыні РВК і ўпаўнаважанага АДПУ. Адначасова ўскласьці пэрсанальную адказнасьць за перавозку бульбы з глыбінных пунктаў, на станцыі і прыстані на раённыя тройкі.

Рашэньне «шасьцёркі» па пытаньнях адгрузкі бульбы і гародніны разглядаецца як рашэньне СНК і ЦК КП(б)Б і падлягае бязумоўнаму выкананьню ўсімі арганізацыямі.

2. У сувязі з павялічэньнем пляну вывазу бульбы Ленінграду — замест 165 тыс. тон — 191 тыс. тон за лік прамысловасьці, даручыць т. т. Бэнэку, Балціну, Хаскіну, Красоўскаму і Дымшыцу, на працягу 11-X разьмеркаваць гэтае дадатковае заданьне ў колькасьці 26 тыс. тон па раёнах, спусьціўшы гэтае заданьне раёнам па тэлеграфу.

Адначасова з гэтым спусьціць агульнае аперацыйнае заданьне кожнаму раёну ў паасобку па адгрузцы бульбы Ленінграду, устанавіўшы штодзённае аперацыйнае заданьне і справаздачнасьць аб выкананьні.

3. Лічыць неабходным паспаць у 15 рашаючых раёнаў (Ворша, Асіповічы, Бабруйск, Буда-Кашалёўск, Быхаў, Бялынічы, Клічаў, Крупкі, Парычы, Гагачоў, Слуцак, Сіроціна, Уваравічы, Церахаўка, Шклоў), якія даюць каля 30 проц. усяго пляну адгрузкі бульбы Ленінграду, групу адказных таварышоў.

Прасіць Ленабком УсеКП(б) і Ленаблвыканком выпучыць для гэтай мэты 20 адказных таварышоў.

4. У мэтах арганізацыі бесьперабойнай работы чыгуначнага і воднага транспарту па адгрузцы бульбы Ленінграду, прапанаваць:

а) Упаўнаважанаму Наркамшляхоў Зносін тав. Эгле выпучыць таварыша, які адказвае перад Саўнаркомам і ЦК за бесьперабойную падачу вагонаў для адгрузкі. Прозьвішча гэтага таварыша паведаміць у «шасьцёрку»;

б) прапанаваць упаўнаважанаму Наркамвода т. Пачэбуду выпучыць на час адгрузкі бульбы Ленінграду аднаго з сваіх намесьнікаў з месцам знаходжаньня яго пры аперацыйнай шасьцёрцы (СНК), які-б адказваў за бесьперабойную перавозку бульбы і гародніны водным шляхам.

5. У сувязі з увядзеньнем СПА з 10.X—32 году эканамічнага рэгуляваньня перавозак бульбы на транспарце, прапанаваць т. Эгле бездакладна правесьці гэтэ мерапрыемства ў жыцьцё па ўсёй чыгуначнай сетцы БССР, забараніўшы якія-б там ні было перавозкі бульбы без дазволу аперацыйнай шасьцёркі ЦК і Саўнаркому да выкананьня цэнтралізаваных пляноў адгрузкі.

6. Абавязаць упаўнаважанага НК Сувязі тав. Дубіну даць катэгарычныя ўказаньні па ўсёй тэлефонна-тэлеграфнай сетцы аб першачарговасьці перадачы тэлеграм і тэлефонных разгавораў па пытаньні адгрузкі бульбы і гародніны Ленінграду.

7. Прыняць да ведама заяву старшыні Ленсавету т. Кадацкага, што на час адгрузкі бульбы Ленінграду, Ленаблвыканком не пазьней 15.X прадстаўляе БССР для гэтай мэты 15 грузавых аўтамашын.

8. Прыняць да ведама заяву т. Фрумкіна (Галоўдартранс), што з 25 кастрычніка ён перакідвае 15 грузавых машын у найбольш рашаючыя раёны па вывазцы бульбы Ленінграду.

9. Адзначаючы недастатковую работу друку ў сэнсе асьвятленьня ходу адгрузкі бульбы і гародніны Ленінграду, прапанаваць цэнтральнаму і раённаму друку шырока паставіць работу па асьвятленьні ходу адгрузкі бульбы і гародніны Ленінграду, вызначыўшы для гэтай мэты спэцыяльныя старонкі ў кожнай газэце.

10. Прыняць да ведама заяву т. Кадацкага, што для праміяваньня асобных работнікаў раёнаў і сельсаветаў у цэлым, якія пасьпяхова выконваюць пляны вывазу бульбы і гародніны Ленінграду спажывецкімі арганізацыямі Ленінграду вызначаецца прэміяльны фонд.

Лічыць неабходным арганізацыю гэтага фонду пры аперацыйнай шасьцёрцы ЦК і СНК, уключыўшы ў гэты фонд і сродкі прамысловасьці (НКЗем, НКСнаб), вызначыўшы яго ў суме 120 тыс. руб.

Прапанаваць т. Бэнэку арганізаваць работу па прэміяваньні раёнаў, сельсаветаў і асобных работнікаў з такім разьлікам, каб гэтае прэміяваньне праводзілася бездакладна па скончэньні раёнамі ці сельсаветамі пляну загатовак і адгрузкі, шырока асьвятляючы гэтую работу ў друку.

11. Адзначаючы зусім нездавальняючую работу цэнтральнай плодагароднай канвэнцыі, прапанаваць т. Бэнэку ажывіць работу гэтай канвэнцыі з такім разьлікам, каб яна зьявілася рашаючым зьвяном у рэгуляваньні ўсёй плодагароднай загатоўчай кампаніі як у адносінах рэгуляваньня цэн на рынках, так ў адносінах ліквідацыі момантаў ажытажу.

Усіх загатоўцаў, парушаючых правілы канвэнцыі, зьнімаць з загатовак.

12. Забараніць мясцовым арганізацыям на час загатовак зьняцьце і перакідку работнікаў з загатоўчага апарату на другія вучасткі работы, а дзе яны ўзяты, бездакладна вярнуць на сваю непасрэдную работу.

13. Указаць раённым партыйным і савецкім арганізацыям, што капаньне, загатоўка і вываз бульбы ў Ленінград павінны праходзіць як адна з буйнейшых гаспадарча-палітычных задач, стаячых ня толькі на-роўні з усімі загатоўкамі, але як першачарговая задача сёньняшняга дня.

14. Даручыць ЦКК-РСІ ўстанавіць штодзенны кантроль і нагляд за выкананьнем гэтай пастановы і інфармаваць падэкадна ЦК КП(б)Б, СНК БССР і ЦКК УсеКП(б).

15. Папярэдзіць раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі, што ўсе дадатковыя заданьні на вываз бульбы Ленінграду ніякаму апраставаньню з боку раёнаў не падлягаюць.

16. Лічыць галоўнейшай задачай органаў Наркамзему, Калгасцэнтру, саўгасаў і калгасаў на даны пэрыяд — хутчэйшае скончэньне капаньня бульбы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

11 кастрычніка 1932 г.
г. Менск.

Практычна рэалізаваць пастанову ЦК і СНК

ДА УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І КАЛГАСЬНІЦ, ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ, РАБОЧЫХ САЎГАСАЎ, УСІХ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР

Адкрыты ліст калгасу імя Пакроўскага, Дзяржынскага раёну

Таварышы!

Наш калгас, як і ўсе калгасы БССР, прыходзіць да юбілею 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі з вялікімі перамогамі. Аднак, мы сёньня павінны адкрыта заявіць аб нашых недахопах для таго, каб з бальшавіцкай энэргіяй змагацца за далейшыя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Дрэнна яшчэ мы змагаемся за якасьць нашай работы. У выніку — надзвычай нізкі ўраджай. Нас ня можа задаволіць ураджай жыта — 40 пудоў, аўса — 30 пудоў, бульбы — 400—500 пудоў з аднаго га, які мы атрымлівем з нашых палёў.

Перад намі паўстае пытаньне, чаму-ж не расьце, а часамі зьмяншаецца ўраджай у нашым калгасе? СССР стварыла самае буйнае зямляробства, пасьпяхова падводзіцца пад яго перадавая тэхніка, укладаецца на мілярды рублёў розных сродкаў і побач з гэтым маем такі нізкі ўраджай. Чым тлумачыць такую неадпаведнасьць?

Мы зварачаем вашу ўвагу на тыя перашкоды, якія тармозяць пасьпяховасьць уздыму ўраджайнасьці і якія ва што-б там ні стала ў самы кароткі тэрмін павінны быць зьнішчаны.

Усякаму вядома, што калі зямлю ня вырабіць, як гэтага патрабуе аграпамія, ўсе намаганьні да ўздыму ўраджайнасьці не дасягнуць мэты. **Пачынаць баявы паход за высокі ўраджай патрэбна іменна з апрацоўкі глебы.** Поле, як жывы арганізм, патрабуе адпаведнага адпачынку і жыўленьня. Гэту задачу вырашае правільны севазварот і, у прыватнасьці, культурны папар.

У пытаньні арганізацыі папару наш калгас не крануўся наперад. Поле, прызначанае пад папар, адначасова зьяўляецца і выганам для жывёлы. Ледзь толькі прасохне зямля, на папар выганяюцца табуны жывёлы, якая трамбуе яго, ператвараючы папар у сапраўдны ток. Усё, што толькі было добрага на гэтым полі, хутка гіне.

Затое на такім папары знайшлі найлепшы прытулак розныя пустазельлі, шкоднікі сацыялістычных палёў. Папар ператвараецца ў сваю процілегласьць — з элемэнту ачысткі поля, ён стаў расаднікам пустазельля. Ляжыць гэты «папар» накранутым да ліпеня—жніўня месяца. Потым на скорую руку пераворваецца адзін-два разы і засяваецца азімымі. Насеньне, трапіўшае ў такую глебу, не расьце, а марнее і вельмі часта не апраўдвае затрат, зробленых на апрацоўку і засеў.

На дадным этапе будаўніцтва калгасаў пытаньне здавальняючага ўгнаеньня глебы ня можа быць вырашана адным гноем і штучнымі ўгнаеньнямі. Затое ў нашай рэспубліцы ёсьць магчымасьць даноўніць гэты недахоп шляхам засеву лубіну. І вось тут таксама недарэчнасьць. **Як наш, так і шмат іншых калгасаў, перасталі сеяць лубін.** Засеў зялёнага ўгнаеньня значна зьнізіўся. Аб гэтым сьведчаць лічбы. Летась у нас зусім ня было пасеву лубіну. Сёлета было пасеяна толькі 20 га, у той час, як пару год назад тут сеяліся сотні га лубіну.

Значна зьнізіўся ў нас і пасеў капюшыны, вікі, сэрадэлы. Калі ў 1931 г. засеў гэтых культур у нашым калгасе быў 20 га, то ў 1932 г. — толькі 7 га. Гэта сьведчыць аб тым, што намі невыстарчальна скарыстоўваецца такі магутны вагар у справе ўгнаеньня глебы, а значыць і ўздыму ўраджайнасьці, як карэньні бабовых, якія маюць у сабе шмат азоту, чаго іменна не хапае нашай глебе.

Увядзеньне правільнага севазвароту дасьць магчымасьць упарадкаваць арганізацыю палявой гаспадаркі. **Устанавіць цьвёрды, адпаведны спэцыялізацыі данай гаспадаркі, севазварот — гэта значыць унікнуць бяссыстэмнага высмоктваньня творчых сокаў зямлі.**

Пры севазвароце наглядна будзе відаць, дзе якая культура павінна займаць месца на полі, каб даць найбольшы ўраджай. Нічым іншым, як адсутнасьцю севазвароту, нельга тлумачыць пасеў жыта па жытнішчы, аўса па аўсяніччы, што вельмі часта назіраецца ў практыцы паасобных калгасаў. Вядома, што гэта вядзе да абясьсільваньня глебы.

Аднак, севазвароты ўводзяцца злачынна марудным тэмпам. Напрыклад, у нашым раёне **са 120 калгасаў толькі ў 12 уведзен севазварот.** У нас таксама севазварот ня ўведзен. Гэта і ня дзіва пры тэй інэртнасьці кіруючых і навукова-дасьледчых установ, якія больш усяго займаюцца гутаркамі, а не практычнай работай па ўвядзеньні севазвароту. Тымавыя севазвароты яшчэ не распрацаваны, а калі яны дзе і ёсьць, дык зьяўляюцца здабыткам габінэтаў.

Нельга не закрануць пытаньня скарыстаньня машын. Мы спынімся на аднэй з іх — сявяркі.

Даўно вядома, што радавы пасеў ачышчаным і гатуновым насеньнем павышае ўраджайнасьць прыблізна на 10 проц. Колькі тысяч тон збожжа не дабірае наша краіна з-за таго, што шмат дзе сявяркі іржавеюць без работы? Прыклад з нашага раёну. У раёне ёсьць 60 радавых сявярак, г. зн. што пры добрым іх скарыстаньні ўвесну можна было-б пасеяць 1.500 га радавога пасеву. А пасеяна толькі 500 га. Паводле грубага падліку, наш раён з-за гэтага не дабраў 70 тон збожжа, перавыдатковаў пры ручным засеве 35 тон насеньня.

Падкрэсьліваем, гэта па адным раёне. А па БССР гэта лічба, мабыць, памножыцца на дзесяткі раз.

Штучных угнаеньняў у нас надзвычай мала. На фоне гэтага недахвату вялікім злачынствам зьяўляецца той факт, што **вагоны ўгнаеньня амаль гадамі ляжаць пад адкосамі на станцыях чыгунак, валяюцца без скарыстаньня ў шмат якіх калгасах.**

Ясна, што пры такой абстаноўцы ігнаруецца агратэхніка. Аўладаньне справай тэхнікі сельскай гаспадаркі ў загоне. Аграномы скарыстоўваюцца дзе толькі хочаце, але не ў якасьці праваднікоў сельска-гаспадарчай навукі ў калгасы.

Што за прычыны парадзілі такія небясьпечныя для ўраджаю зьявішчы?

Адсутнасьць належнага кіраўніцтва і бесгаспадарчасьць у плянаваньні палявой гаспадаркі калгасу — вось агульны адказ на гэта.

Нашы кіруючыя арганізацыі раёну не зварачаюць увагі на тое, у якім становішчы калгасныя палі, і бяз уліку асаблівасьцяй кожнага калгасу паасобку, мэханічным парадкам даводзяць пляны пасеву. Напрыклад, нашаму калгасу было даведзена засеяць 200 га жыта, 2 га капусты і 10 га азімай пшаніцы. У калгасе-ж было адведнай глебы на 193 га жыта, а пад капусту і пшаніцу адведнага поля ўсім ня было. Але пад напорам райкалгассаюзу мы засеялі 200 га жыта, 2 га капусты і 10 га пшаніцы. **У выніку 7 га жыта, якое было засеяна па іржэўчыны, два га капусты, засеяныя на папары, і 10 га пшаніцы, пасеянай на лубіне, загінулі.** Загінула наша праца, насеньне, пуставала 19 га поля.

Такіх прыкладаў толькі па адным нашым раёне можна знайсьці дзесяткі.

Гэта сьведчыць аб тым, што перад тэндэнцыяй казённа-мэханічнага папырэньня пасеўплошчы, на самы задні плян адступіла барацьба за якасьць, эфэктыўнасьць, г. зн. ураджайнасьць поля. **Мы за пашырэньне пасеўных плошчаў. Але гэту работу трэба арганізаваць умела, выкараняючы ўсякі бюракратызм.** Пры ўмове чулага падыходу да кожнага калгасу, стварэньня ўмоў для шырокай ініцыятывы калгасьнікаў у пытаньні арганізацыі палявой гаспадаркі — агульнараённы плян быў-бы выканан і значна ўзрос-бы ўраджай.

Партыя правільна і своячасова паставіла пытаньне ўздыму ўраджайнасьці цэнтральнай задачай зямляробства. **Пастанова ЦК і СНК СССР ад 29 верасьня канкрэтна намячае шляхі барацьбы за высокі ўраджай сацыялістычных палёў.** Гэта дырэктыва павінна паслужыць **пераломным** пунктам ва ўсёй нашай рабоце па павышэньні якасьці зямляробства.

Кожны пункт пастановы ЦК і СНК насычан глыбокім зьместам, натхняе нас на змаганьне.

У якасьці практычнай рэалізацыі пастановы ЦК і СНК аб уздыме ўраджайнасьці мы выстаўляем рад канкрэтных пунктаў.

Добраякасную апрацоўку глебы мы ставім цэнтральнай задачай нашай работы. Для вырашэньня яе мы ўжо шмат робім. Хоць у нас севазварот і не ўстаноўлен, але-ж мы праводзім да гэтага падрыхтоўчую работу. Пасевы робім (унікаючы пасеву па неадпаведнай глебе) буйнымі вучасткамі. Напрыклад, 205 га жыта пасеялі па двух вучастках. Тое-ж самае робім і ў справе падрыхтоўкі глебы пад яравыя пасевы 1933 г. З вясны будучага году ўводзім шматпольны севазварот.

Заканчваем зяблівае ворыва ў ліку 350 га.

Падрыхтавана насеньне лубіну для засеву 150 га на зялёнае ўгнаеньне і 20 га на насеньне.

Пашыраем засеў канюшыны, вікі, сэрадэлы на 90 га.

Папар позьні ліквідуем, уводзім чысты і заняты, як найбольш карысны для гаспадаркі.

Гной і ўсякія ўгнаеньні кладзем галоўным чынам пад больш каштоўныя культуры.

Кожнай культуры адводзім тое поле, на якім яна дасьць найбольшы ўраджай.

Мабілізуем усе мясцовыя сродкі для павялічэньня фонду ўгнаеньня глебы, як збор попелу, закладка кампостных куч і г. д.

Абавязваемся пасеяць увесну 1933 г. ячмень, пшаніцу і авёс на насеньне радавым сявяркамі. Увесь пасеў яравых будзем рабіць гатуновым і адсартаваным насеньнем.

Арганізуем два сельска-гаспадарчых гурткі па аўладаньні агратэхнікай.

Пасевы будзем рабіць у тэрміны, найбольш спрыяючыя росту ўраджайнасьці.

Для пасьпяховасьці змаганьня за высокі ўраджай мы прапануем ужо зараз разгарнуць падрыхтоўку да чацьвертай бальшавіцкай пасеўкампаніі. Цяпер трэба рыхтаваць насеньне, выканаць плян зяблева, захоўваць сельска-гаспадарчы інвэнтар, зрабіць вывады з існуючай арганізацыі брыгад для далейшага паляпшэньня іх работы. **Змагаючыся за пасьпяховае завяршэньне палявых работ бягучага году, разгорнем падрыхтоўку да пасеўкампаніі 1933 г.**

Эфэктыўнасьць нашых захадаў будзе вымяравацца ростам ураджаю. Мы канкрэтна ставім сабе задачу — **дабіцца росту ўраджайнасьці яравых культур на 25 проц. і азімых на 50 проц.**

Гэта лічба росту ўраджайнасьці з сёньняшняга дня становіцца нашым штодзённым лёзунгам у рабоце, за ажыцьцяўленьне якога мы ўсімі сіламі будзем змагацца.

Мы заклікаем усе калгасы, саўгасы, працоўных аднаасобнікаў, спэцыялістаў сельскай гаспадаркі прыняць самы актыўны ўдзел у справе ўсямернага павышэньня ўраджайнасьці.

Давайце да 15-гадовага юбілею Кастрычніка будзем рапартаваць партыі і ўраду аб захадах па павышэньні ўраджайнасьці, практычным ажыцьцяўленьні пастановы ЦК і СНК ад 29 верасьня.

Па даручэньні агульнага сходу ліст падпісалі:



СЁНЬНЯ ў будынку яўрэйскага дзяржаўнага тэатру (былы Дом Культуры) а 6-ай гадзіне ўвечары

СКЛІКАЕЦЦА

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б

разам з членамі ЦК, ЦКК, гарКК КП(б)Б, якія знаходзяцца ў Менску, і гарадзкім і гарнізонным партактывам.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і задачах партарганізацыі Беларусі (даклад тав. ГІКАЛО).

Члены і кандыдаты ЦК, Менгаркому, ЦКК і ГарКК КП(б)Б праходзяць на сваіх мандатах.

Партактыў праходзіць па спэцыяльных прапусках, якія будуць выдавацца сакратаром парт'ячэек 11, 12, 13 кастрычніка ў гаркоме партыі (пакой 32) з 10 да 4 гадзін дня.

БЮРО МЕНГАРКОМУ.

Бязьлітасны адпор ворагам Ленінскай партыі

Сьледуючы ўказаньням Леніна, працягваючы балвыя традыцыі бальшавізму, партыя дабілася вялізарных посьпехаў за ўсіх галінах народна-гаспадарчага жыцьця. Яна гігантскі вырасла, увабраўшы ў свае рады меншае, што ёсьць у нашай гераічнай рабочай клясе, у нашым калгасным сялянстве. Яна стала несакрушальнай сілай. Ёй па плячы сталі такія грандыёзныя задачы, як выкананьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва за чатыры гады. Яна адбила ўсё спробы розных антыпартыйных груп разлажыць яе рады, аслабіць яе ролю, яе адзінства. Партыя дабілася вялізарнейшых посьпехаў ва ўсіх галінах работы імення таму, што яна сыстэматычна давала бязьлітасны адпор апартуністам усіх масьцей, разграміўшы арганізацыі трацкістаў і правых апартуністаў.

Пераважная маса былых апазыцыянэраў, усьвядомўшы і выпраўляючы свае памылкі, на справе пераканаўшыся ў правільнасьці партыйнай лініі, вярнулася на ленінскія пазыцыі, працуе ў радох партыі, дружна будуе разам з мільёнамі перадавых рабочых і калгасьнікаў першую ў сьвеце сацыялістычную дзяржаву.

За гэтыя гады пераможаны гігантскія труднасьці, міжнародныя і ўнутраныя. Краіна Саветаў перад тварам найглыбейшага крызісу, які патрасае ўвесь астатні сьвет, стаіць несакрушальнай крэпасьцю пралетарскай дыктатуры, сацыялістычнага будаўніцтва. Вялізарныя, бясспрэчныя нават для нашых ворагаў, посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва выклікаюць шалёную нянавісьць клясавага ворага. Гэты рост краіны Саветаў і яе сацыялістычнае наступленьне ня могуць ісьці так «гладка» і «плаўна», як аб гэтым мараць апартуністы — без барацьбы, без перамаганьня шкалёнага супраціўленьня ўсіх, хто варожы нашаму шляху сацыялістычнай перабудовы вялізарнай краіны.

А гэта значыць, што «новыя посьпехі сацыялізму рабочая кляса забясьпечыць толькі ў барацьбе з рэшткамі капіталізму, даючы бязьлітасны адпор супраціўленьню гінучых капіталістычных элемэнтаў, перамагаючы буржуазныя і дробна-буржуазныя забабоны сярод працоўных і вядучы настойлівую работу на сацыялістычным іх перавыхаваньні» (рэзалюцыя XVII канфэрэнцыі ВсеКП(б).

XVII партканфэрэнцыя прадбачыла, «што і ў далейшым яшчэ нямінуча абвастрэньне клясавай барацьбы ў асобных моманты і асабліва ў асобных раёнах і па асобных участках сацыялістычнай будоўлі, што разам з тым падкрэсьлівае нямінучасьць захавань ня, а ў некаторых выпадках і ўзмацненьня буржуазных уплываў на асобныя пласты і групы працоўных, нямінучасьць яшчэ на працягу доўгага часу праясканьня чужых пралетарыяту клясавых уплываў у асяродзішча рабочых і пават у партыю».

Вось чаму мы наглядалі за апошнія гады, што ў моманты асабліва вострага супраціўленьня клясавага ворага асобныя члены партыі, паддаючыся гэтым клясава-варожым настроям, станавіліся іх рупарам, згуртоўваючы групкі для барацьбы супроць ленінскай вытрыманай партыйнай лініі. Гэтыя спробы становяцца з кожным разам усё больш немачнымі. Гэтыя групы выказваюць настроі азлобленага кулака, спэкулянта і тупагаловага дробнага буржуя. Такой групкай і зьяўляецца група Руціна-Галкіна-Іванова і інш., якая злучылася з выключанымі з партыі трацкістамі і іншымі антыпартыйнымі элемэнтамі на глебе абароны самых рэакцыйных поглядаў, якія да гэтага часу прапаведвалі розныя антыпартыйныя і антысавецкія групы.

Гэта контр-рэвалюцыйная група разьвівала ў сваіх дакумантах сапраўдную праграму капіталістычнай рэстаўрацыі і адпаўленьня кулака, прапаведуючы неабходнасьць роспуску саўгасаў і калгасаў, патрабуючы такой палітыкі, якая азначае перадачу ў канцэсіі капіталістам сацыялістычных прадпрыемстваў, створаных гераічнай працай і энтузіязмам рабочай клясы.

Група гэта складаецца, галоўным чынам, з людзей, якія змагаліся на працягу раду год супроць лініі партыі. Лёза іх злобнай «крытыкі» накіравана цяпер супроць таго кіраўніцтва, якое на працягу раду год паказала сваю вернасьць ленінізму, сацыялістычнай рэвалюцыі, Камуністычнаму Інтэрнацыяналу, наказала ўсяму сьвету найвялікшую здольнасьць рухаць наперад сацыялістычную рэвалюцыю ня ў пышных фразах, а ў слаўных справах жывой сацыялістычнай будоўлі. Пастанова прэзыдыуму ЦКК наносіць сакрушальны ўдар гэтай чарговай спробе нападу на партыю з боку дву рушнікаў, якія захаваліся ўнутры партыі. Зразумела, парачка-другая дзесяткаў апазыцыянэраў, якія сканціліся да контр-рэвалюцыі, ня можа пахіснуць нашых радоў, як не змаглі зьвярнуць з ленінскага шляху нашу партыю аб'яднаныя натугі некалі даволі шматлікіх антыленінскіх груп. Тым ня менш гэта справа прымушае зьвярнуць увагу ўсіх членаў партыі на неабходнасьць яшчэ больш рашучай барацьбы з усякімі спробамі пахіснуць давер'е да партыйных пастаноў, на неабходнасьць яшчэ большай клясавай пільнасьці ў адносінах да малейшых праяўленьняў апартунізму.

Дапаможнікамі гэтай контр-рэвалюцыйнай групы аказаліся і такія людзі, як Зіноўёў і Каменеў, як Угланаў. 15 год таму назад напярэдадні Кастрычніка Зіноўёў і Каменеў правялі такія адносіны да пралетарскай рэвалюцыі, да партыйных пастаноў, што Ленін закляймёў іх імем штрэйкбрэхераў і патрабаваў выключэньня іх з партыі. Пасьля гэтага партыя ўсё-ж аказала ім давер'е. Праз 10 год пасьля гэтага яны адплацілі тым, што зноў выступілі з адкрытым бунтам супроць партыі, прабуючы ўцягнуць за сабой партыйныя арганізацыі на шлях антыпартыйнай барацьбы. Яны замяталі тады трацкістаў і іншых ворагаў партыі, забыўшы аб тым, што яшчэ ўчора кляліся ў адсутнасьці ў іх разгалосьсю з партыяй. Разьбітыя і ў гэтай барацьбе, яны заявілі XV партз'езду зьезду, што «падначальваюць сваю волю і свае погляды волі і поглядам партыі». Гэтыя ж паказала ім пасьля гэтага зноў вялізарнейшае давер'е, яна вярнула іх у свае рады, як вярнула многіх другіх, яны даверыла ім адказную работу. Але лёгіка фракцыйнай барацьбы штурхала іх на шлях капсьпірацыі супроць партыі. Замест бязьлітаснага адпору контр-рэвалюцыянэрам, тым, хто злосна паклёпнічаў па партыю, замест выкрыцьця, — пеадкладнага і безагаворачнага, — нічэмных кулацкіх агентаў, якія распаўсюджвалі контр-рэвалюцыйныя дакументы, яны аддалі перавагу келейна абгаворваць гэтыя дакументы, не паведамляючы аб іх партыі, не выкрываючы іх аўтараў, не дапамагаючы партыі ў справе барацьбы з контр-рэвалюцыйнымі групоўкамі, становячыся дапаможнікамі іх. Яны дзейнічалі па лёзгіцы: «вораг майго ворага — мой прыяцель». Вось чаму яны сталі на шлях дапаможніцтва контр-рэвалюцыйнай групе Руціна, як і рад іншых асоб, выключаных па гэтай справе.

Прэзыдыум ЦКК сваёй пастановай надкрэсьлівае, што партыя бязьлітасна выкіне са сваіх радоў усякага, хто стане на шлях апартунізму, на шлях фракцыйнай барацьбы, бо гэты шлях, — як паказаў угесь папярэдні вопыт барацьбы з трацкістамі і правымі апартуністамі і як паказвае гісторыя групы Руціна, Галкіна, Іванова і інш., — вядзе ў лягер контр-рэвалюцыі: жывы прыклад — Л. Троцкі. Партыя яшчэ больш непрымірыма будзе змагацца супроць малейшага прымірэнцтва да апартунізму, патрабуючы бязумоўнай шчырасьці ад кожнага члена партыі ў адносінах да сваёй партыі, да сваіх кіруючых органаў, патрабуючы іх безагаворачнага, самаахвярнага падтрыманьня і абарону.

Лічныя дні засталіся да XV гадавіны Кастрычніка. 15 год назад, калі капітулянты прадракалі пагібель пралетарскай рэвалюцыі, наша партыя павяла адважна ў бой рабочых, сялян і салдат. Чвэрць мільёна было нас, камуністаў, 15 год назад. Трохмільённай арміяй, якая ашіраецца па вялізарныя рэзэрвы камуністычнай моладзі, па дзесяткі мільёнаў арганізаваных рабочых і калгасьнікаў, на мацнейшую базу пралетарскай дыктатуры, на сацыялістычную гаспадарку краіны Саветаў, шакапіўшы багацейшы вопыт барацьбы за сацыялізм, сустракае XV гадавіну Кастрычніка наша партыя. Ачышчаючы сябе напярэдадні гэтай гадавіны ад некалькіх дзесяткаў двуручнікаў, стаўшых на контр-рэвалюцыйны шлях, партыя ўступіць у новую пяцігодку сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ больш упэўненая ў тым, што яна робіць найвялікшую справу пралетараў і працоўных усяго сьвету і што яна давядзе пачатую барацьбу за камунізм да канца. («Правда»).

Пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) ад 9 кастрычніка 1932 г.

Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б), азнаёміўшыся з матар'ялямі сьледзтва па справе аб удзельніках і дапаможніках контр-рэвалюцыйнай групы Руціна, Іванова, Галкіна і інш., пастанаўляе:

I. Выключыць з радоў партыі наступных членаў і дапаможнікаў контр-рэвалюцыйнай групы Руціна (выключаны з партыі) — Іванова (член партыі) — Галкіна (член партыі), як разлажыўшыхся, стаўшых ворагамі камунізму і савецкай улады, як здраднікаў партыі і рабочай клясы, якія прабавалі стварыць падпольным шляхам пад ашуканым сьцягам «марксызму-ленінізму» буржуазную, кулацкую арганізацыю па адпаўленьні ў СССР капіталізму і, у прыватнасьці, кулацтва:

1) **Галкіна П. А.**, б. удзельніка групы правых апартуністаў, арганізатара контр-рэвалюцыйнай групы.

2) **Іванова М. С.**, арганізатара і сакратара контр-рэвалюцыйнай групы.

3) **Замяціна П. М.**, які выключаўся з партыі ў 1921-24 г. г. і падлягаў партспагнаньням за правапартуністычную практыку, арганізатара контр-рэвалюцыйнай групы.

4) **Фёдарава П. П.**, з 1914 да 1920 г. б. эсэра, арганізатара контр-рэвалюцыйнай групы.

5. **Дзямідава В. І.**, зьнятага з партработы за прымірэнцтва да правых апартуністаў, арганізатара контр-рэвалюцыйнай групы.

6) **Каюрава В. Н.**, арганізатара контр-рэвалюцыйнай групы, служыўшага для сувязі з былой «рабочай апазыцыяй».

7) **Каюрава А. В.**, аднаго з удзельнікаў контр-рэвалюцыйнай групы, які друкаваў і распаўсюджваў яе контр-рэвалюцыйную літаратуру.

8) **Сьляпкова А. Н.**, як правага апартуніста, які раней два разы выключаўся з партыі, садзейнічаў контр-рэвалюцыйнай групе распаўсюджваньнем яе літаратуры

9) **Марэцкага Д. П.**, як правага апартуніста, які выключаўся з партыі і садзейнічаў распаўсюджаньню контр-рэвалюцыйнай літаратуры.

10) **Мэбэля М. І.**, актыўнага распаўсюджвальніка дакумантаў контр-рэвалюцыйнай групы, даўнага пры выкліку ў ЦКК УсеКП(б) ілжывыя паказаньні.

11) **Рэхкіна Г.**, б. буцдаўца, які выключаўся з партыі за скажэньне партыйнай лініі, актыўнага распаўсюджвальніка контр-рэвалюцыйнай літаратуры групы.

12. **Пташнага Б. М.**, які выключаўся з партыі за трацкісцкую дзейнасьць, удзельніка контррэвалюцыйнай групы.

13) **Токарава С. В.**, арганізатара групы і актыўнага распаўсюджвальніка контр-рэвалюцыйных дакумантаў групы.

14. **Васільлева Н. І.**, які выключаўся за прыналежнасьць да трацкісцкай апазыцыі, удзельніка контр-рэвалюцыйнай групы.

15) **Каюраву Н. П.**, за друкаваньне контр рэвалюцыйных дакумантаў групы.

16) **Зямяціну-Чорных К. А.**, за друкаваньне контр-рэвалюцыйных дакумантаў групы.

17) **Колакалава Н. І.**, як утойвальніка контр-рэвалюцыйнай групы.

18. **Гарэлава В. Б.**, які выключаўся з партыі за актыўны ўдзел у нелегальнай контр-рэвалюцыйнай рабоце трацкістаў і прымаў удзел у дзейнасьці контр-рэвалюцыйнай групы.

19) **Зіноўева Г. Е.** і

20) **Каменева Л. Б.**, былых арганізатараў антыпартыйнага і антысавецкага блёку апазыцыйных груп, якія выключаліся з партыі і былі адноўлены толькі пасьля іх заявы да XV зьезду партыі, што яны цалкам падпадчальваюць «сваю волю і свае погляды волі і поглядам партыі», ашукаўшых аказанае ім давер'е партыі, здрадзіўшых ёй, ведаючы аб іспавальні гэтай контр-рэвалюцыйнай групы, атрымалі ад гэтай групы яе дакументы, не давялі да ведама партыі, чым садзейнічалі яе дзейнасьці.

II. Выключыць з радоў УсеКП(б), прадаставіўшы im права праз год, у залежнасьці ад іх паводзін, узбудзіць пытаньне аб перагляндзе данай пастановы:

1) **Стэна Я. З.**, былога ўдзельніка «лева»-апартуністычнай апазыцыі, які распаўсюджваў контр-рэвалюцыйныя дакументы групы і даваў пры тлумачэньні ЦКК УсеКП(б) ілжывыя паказаньні.

2) **Пятроўскага П. Г.**, был. удзельніка праваапартуністычнай апазыцыі, які ўтаіў ад партыі іспаваньне гэтай групы і тым садзейнічаў яе контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці.

3) **Углава Н. А.**, былога ўдзельніка праваапартуністычнай апазыцыі, ведаўшага аб іспаваньні і дзейнасьці контр-рэвалюцыйнай групы, утаіўшага гэта ад партыі і тым самым садзейнічаўшага контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці гэтай групы.

4) **Равіча-Чэркаскага М. Е.**, утаіўшага ад партыі свае сувязі з контр-рэвалюцыйнай групай (атрыманьне дакумантаў) і тым самым садзейнічаўшага яе дзейнасьці.

ПРЭЗЫДЫУМ ЦКК УсеКП(б).

ПАЛЕПШЫЦЬ ЗЬМЕСТ РАБОТЫ ВЯСКОВАЙ ЯЧЭЙКІ

(На аргпартнарадзе пры ЦК КП(б)Б)

10 кастрычніка адкрылася ўсебеларуская нарада загатовыкаў аргадзелаў гарадзкіх і раённых камітэтаў КП(б)Б.

З кароткім дакладам аб арганізацыйна-партыйнай рабоце на вёсцы выступіў інструктар ЦК КП(б)Б тав. **Галодка.**

Гаворачы аб папярэдніх выніках праробленага ў гэтай галіне, тав. Галодка падкрэсьліў, што пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па вёсцы рэалізуюцца надзвычай **павольнымі тэмпамі.** Найбольш яркім паказальнікам гэтай павольнасьці зьяўляецца рост. З кварталу ў квартал крывая росту вясковай партарганізацыі падае.

Гэтага, зразумела, нельга сказаць аб усіх раёнах. У разе месц ёсьць пэўныя зрухі ў рэалізацыі пастаноў ліпеньскага пленуму. Полацкі, Клімавіцкі райкомы стварылі моцныя інструктарска-прапагандысцкія групы, дабіліся прыкладнай работы некаторых апорных ячэек. У гэтых раёнах па многіх калгасных брыгадах арганізаваны парторгі, перакінуты шмат камуністаў на работу на вытворчасьці, мабілізавана з раёну каля 10 чал. для ўмацненьня ячэек і г. д.

Але гэтыя райкомы, як і ўсе астатнія, не займаюцца як сьлед пытаньнямі палепшэньня **зьместу** работы ячэек.

Галоўная прычына такога становішча ў тым, што арганізацыйна-партыйная работа **недаацэньваецца.**

Вось таму загадчыкі аргадзелаў займаюцца усім, чым хочаце і менш усяго пытаньнямі ўнутрыпартыйнага будаўніцтва.

Райкомы павінны зараз сканцэнтраваць сваю ўвагу на пытаньнях арганізацыйна-партыйнага будаўніцтва, дабіваючыся палепшэньня зьместу работы ўсіх зьвеньняў.

Па-першае, неабходна ўзяцца як сьлед за умацаваньне кадраў раённых і ячэйкавых работнікаў. Самым балючым пытаньнем у гэтых адносінах зьяўляецца цякучасьць. Вось, напрыклад, у вясковай арганізацыі Гомельшчыны сакратары ячэек за 1932 год зьмяняліся: у чатырох ячэйках 2 разы, у 6 ячэйках 3 разы, у трох ячэйках 4 разы, у дзьвёх — 5 разоў.

Трэба абвясьціць самую жорсткую барацьбу цякучасьці і разам з тым заняцца пытаньнямі вылучэньня і падрыхтоўкі пізавых кадраў. Неабходна для гэтага ажыцьцявіць пастанову ліпеньскага пленуму аб арганізацыі ў кожным раёне курсаў, якія-б функцыянавалі круглы год.

Вясковыя арганізацыі, як і гарадзкія, праводзячы перабудову, павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу на стварэньні **сярэдняга зьвяна.** У вёсцы гэту задачу трэба вырашыць па-іншаму — выходзячы з умоў раёну. Але сваяасаблівае сярэдняе зьвяно для вёскі патрэбна. Гэта дыктуецца самім жыцьцём, дыктуецца неабходнасьцю налепшыць кіраўніцтва райкому пізавой ячэйкай.

Райкомы зараз «выяжджаюць» на ўпаўнаважаных. У гэтай сыстэме шмат адмоўнага. Упаўнаважаны вельмі часта падмяняе ячэйку, часамі адмініструє і забівае ўсякую ініцыятыву вясковых камуністаў.

Неабходна прагледзець сыстэму ўпаўнаважаных, удасканаліць яе і разам з тым, узяцца за стварэньне сярэдняга зьвяна. Такім зьвяном павінна зьяўляцца інструктарска-прапагандысцкая група, апорная ячэйка, сакратары ячэек МТС, саўгасаў і буйных калгасаў.

Асновай сярэдняга зьвяна зьяўляецца апорная ячэйка. Яе трэба ўсямерна ўмацняць, лепш ёю кіраваць.

Востра стаіць у нас пытаньне з расстаноўкай партыйных сіл. Можна прывесьці шмат фактаў, калі камуністы працуюць на другарадных работах, іншы раз зусім нічога ня робяць, а важнейшыя вучасткі вытворчасьці камуністычнымі сіламі не забясьпечаны.

Далей тав. Галодка спыніўся на пытаньнях структуры вясковай арганізацыі, работы з адзіночкамі і **палепшэньні зьместу** работы вясковай ячэйкі.

* * *

У спрэчках па дакладу першым выступіў сакратар парткалектыву Менскага прыгараднага саўгасу тав. **Лікарпенка,** а за ім сакратар ячэйкі саўгасу «Русінавічы» тав. **Матусэвіч.** Абодва прамоўцы дзяліліся вопытам ужо праробленага ў галіне перабудовы.

Да канца вячэрняга пасяджэньня 10-га кастрычніка ў спрэчках выступілі т. т. **Стасенка** (Полацак), **Вашкевіч** (Жыткавічы) і **Ваксман.**

Мы павінны, — гаворыць тав. **Вашкевіч,** — ухапіцца абедзьвюма рукамі за такое важнае мерапрыемства, як арганізацыя курсаў, якія-б функцыянавалі круглы год. Наладзіўшы работу гэтых курсаў, мы зможам узьняць палітычны ўзровень вясковага камуніста і гэтым значна палепшыць работу ячэйкі.

* * *

На ранішнім і вячэрнім пасяджэньні 11 кастрычніка нарада распрацавала пытаньне работы вытворчай ячэйкі.

З вялікай прамовай па нарадзе выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. **ГІКАЛО.**

11-га вечарам нарада скончыла сваю работу.

В. С.

РАПАРТАМІ ПЕРАМОГ СУСТРЭЦЬ 15-ю ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКА

КЛІМАВІЦКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, ДЗЯРЖЫНСКІ, КАМАРЫНСКІ і ТУРАЎСКІ РАЁНЫ ПА-ЎДАРНАМУ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў КАЛЁНЕ БАЙЦОЎ ЗА ЗБОЖЖА

Раўненьне па перадавых калгасах—ударніках загатовак

Праўленьне Белкалгасцэнтру 8-га кастрычніка вынесла спэцыяльную пастанову аб ходзе збожжазагатовак.

— На 5 кастрычніка калгасны сэктар БССР, — гаворыцца ў пастанове, — выканаў гадавы плян збожжазагатовак на 52,8 проц.

Калгасы ЖЫТКАВІЦКАГА, ЛЕЛЬЧЫЦКАГА, КЛІМАВІЦКАГА, ТУРАЎСКАГА, ЕЛЬСКАГА і АСЬВЕЙСКАГА раёнаў ужо выканалі свае гадавыя пляны. Калгасы — Дзяржынскага, Петрыкаўскага, Любаньскага, Бярэзінскага, Барысаўскага і Расонскага раёнаў набліжаюцца да поўнага выкананьня гадавога пляну (85-95 проц.).

Яны шляхам шырока разгорнутай масавай работы, правільнага злучэньня ўборкі з абмалотам і здачай збожжа, дабіліся значных посьпехаў у загатоўках.

Побач з гэтым, рад раёнаў працягваюць адставаць ад агульных тэмпаў загатовак. Калгасы Бешанковіцкага раёну здалі толькі 20 проц., Бяляніцкага — 26,8 проц., Вушацкага — 28,3 проц., Чавускага — 16,6 проц., Быхаўскага — 25,3 проц., Кармянскага — 18,8 проц., Чырвонапольскага — 20,5 проц. і Нараўлянскага — 26,0 проц. гадовага заданьня. Калгассаюзы пералічаных раёнаў недаацанілі збожжазагатовак, не разгарнулі масавай работы, не далі належнага адпору рвацкім тэндэнцыям адсталай часткі калгасьнікаў.

Становішча са збожжазагатоўкамі ў пералічаных раёнах стварае пагрозу невыкананьня абавязацельстваў, прынятых на сябе калгасным сыстэмай аб сканчэньні загатовак да 15-й гадавіны Кастрычніка.

Праўленьне Калгасцэнтру канстатавала зусім недапушчальныя адносіны калгассаюзаў і праўленьняў калгасаў да звароту насеннапазыкі, якая павінна спагняцца адначасова з выкананьнем пляну збожжазагатовак. Зьвернута толькі 361 тона насеннапазыкі, або 3,7 проц. заданьня.

Праўленьне Белкалгасцэнтру папярэдзіла калгассаюзы Бешанковіцкага, Бяляніцкага, Вушацкага, Лепельскага, Сеньненскага, Чавускага, Быхаўскага, Кармянскага, Уваравіцкага, Чырвонапольскага і Нараўлянскага раёнаў, што калі яны на дабіюцца рашучага пералому ў тэмпах здачы збожжа, да іх будуць прыняты самыя суровыя меры спагнаньня.

Праўленьне Калгасцэнтру пастанавіла прэміяваць за датэрміновае выкананьне гадавых плянаў збожжазагатовак: калгасы «БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ» і «КАСТРЫЧНІК», Клімавіцкага раёну, «ХВАЛЯ РЭВАЛЮЦЫІ» і «Х КАСТРЫЧНІК», Аршанскага раёну — па 200 руб.; «СЕМАФОР», Смалявіцкага раёну, «ЧЫРВОНЫ БАЕЦ», Веткаўскага раёну, «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ», Чачэрскага раёну — па 150 рублёў; калгасы «Нараджэньне сацыялізму» і «КІМ», імя Будзённага, Чырвона-Слабодзкага раёну, імя Сталіна, Быхаўскага раёну, якія, апрача выкананьня пляну збожжазагатовак, выканалі гадавыя заданьні па ільнанасеньні, малаку і бульбе, — прэміяваны па 200 руб., імя Молатава, імя Леніна (Лучнікаўскі і Леніскі сельсаветы, Слуцкага раёну) — па 250 рублёў.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

ЗА ЗУСІМ ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА, ЗА ПЕРАБУДОВУ РАБОТЫ НА АСНОВЕ ГІБКАГА, КАНКРЭТНАГА КІРАЎНІЦТВА, БАРАЦЬБЫ З АДМІНІСТРАВАНЬНЕМ І ЗА РАЗГОРТВАНЬНЕ МАСАВАЙ ПРАЦЫ ПАВЕДАЕМ НА ЧЫРВОНАЙ ДОШЦЫ НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ:

1. **КЛІМАВІЦКІ** РАЁН, ЯКІ ДА 5-ГА КАСТРЫЧНІКА ВЫКАНАЎ 71,2 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

2. **ЛЕЛЬЧЫЦКІ** РАЁН, ЯКІ ЗДАЎ 66 ПРОЦ. ГАДАВОГА ЗАДАНЬНЯ.

3. НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ **ДЯРЖЫНСКІ** РАЁН, ЯКІ ЗАГАТОВІЎ 62,9 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

4. **КАМАРЫНСКІ** РАЁН—ДА 5-ГА КАСТРЫЧНІКА ЗДАЎ 62 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

5. **ТУРАЎСКІ** РАЁН—ЗДОЛЕЎ ЗАГАТОВІЦЬ 61 ПРОЦ. РАЁННАГА ПЛЯНУ.

НА ПРЫКЛАДЗЕ ПЕРАДАВІКОЎ, УСЕ РАЁНЫ ПАВІННЫ ВУЧЫЦЦА, ЯК ТРЭБА ЗМАГАЦЦА ЗА ЗБОЖЖА.

ЧОРНАЯ ДОШКА

Наступныя раёны пакідаюцца на чорнай дошцы за няўменьне перабудаваць работу, за нядольнасьць ліквідаваць адставаньне ў збожжазагатоўках.

1. **НАРАЎЛЯНСКІ**, які загатовіў толькі 12 проц. гадавога пляну, 2. **КАРМЯНСКІ** раён—здаў 13,6 проц.; 3. **ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ** раён—загатовіў толькі 14,4 проц. гадавога пляну; 4. **ВУШАЦКІ**—14,6 проц.

Ход здачы збожжа па БССР

(У процантах да гадавога пляну на 5 кастрычніка)

№№ па ч.	Назва раёну	Загатоўлена збожжа	Зварот насеннапазыкі	Памольны збор.
1.	Клімавіцкі	71,2	3,1	33,2
2.	Лельчыцкі	66,0	4,5	28,9
3.	Дзяржынскі	62,9	1,4	19,5
4.	Камарынскі	62,0	36,3	32,0
5.	Тураўскі	61,0	—	25,9
6.	Чырвона-Слабодзкі	66,0	—	15,6
7.	Менскі	47,8	1,2	16,9
8.	Ельскі	55,0	8,5	19,2
9.	Смалявіцкі	52,1	9,8	17,3
10.	Жыткавіцкі	52,0	3,8	22,5
11.	Бярэзінскі	51,1	1,2	17,6
12.	Барысаўскі	48,7	0,4	23,5
13.	Старобінскі	48,1	—	16,0
14.	Касьцюковіцкі	47,9	1,0	21,9
15.	Асьвейскі	46,1	—	41,7
16.	Слуцкі	43,2	4,3	16,1
17.	Чэрыкаўскі	43,3	—	24,6
18.	Бабруйскі	43,2	2,4	13,9
19.	Вясковльскі	42,3	0,8	19,5
20.	Віцебскі	42,3	8,2	8,6
21.	Крычаўскі	40,6	—	13,1
22.	Вузьдзенскі	39,5	—	20,0
23.	Капыльскі	39,4	—	16,0
24.	Рагачоўскі	38,7	—	19,8
25.	Пухавіцкі	38,7	27,6	28,8
26.	Аршанскі	38,2	0,5	24,9
27.	Заслаўскі	38,2	11,8	15,4
28.	Плешчаніцкі	37,8	—	15,5
29.	Чэрвеньскі	37,7	—	25,7
30.	Гарадоцкі	36,3	5,2	19,6
31.	Мсьціслаўскі	36,2	—	19,8
32.	Гомельскі	36,1	2,6	17,1
33.	Веткаўскі	35,3	11,1	22,8
34.	Брагінскі	34,9	3,7	19,3
35.	Глускі	34,4	5,1	13,7
36.	Магілеўскі	34,3	1,3	30,3
37.	Чачэрскі	34,2	8,9	17,6
38.	Любаньскі	34,0	—	18,2
39.	Стара-Дарожскі	33,5	7,1	27,5
40.	Жлобінскі	32,0	34,0	20,7
41.	Рэчыцкі	31,7	3,6	17,0
42.	Мазырскі	31,4	10,6	22,8
43.	Лоеўскі	30,9	3,4	15,8
44.	Сіроцінскі	30,6	—	18,8
45.	Дубровенскі	30,3	—	31,4
46.	Бялыніцкі	30,3	12,5	27,1
47.	Буда-Кашалёўскі	28,8	10,3	29,4
48.	Асіпавіцкі	28,5	3,7	17,1
49.	Клічаўскі	28,3	—	13,4
50.	Сураскі	28,0	2,6	23,2
51.	Парыцкі	27,9	11,8	18,0
52.	Расонскі	27,3	3,3	11,5
53.	Уваравіцкі	27,2	17,3	8,7
54.	Прапойскі	27,2	—	14,7
55.	Шклоўскі	27,2	2,8	21,3
56.	Лагойскі	27,2	—	11,6
57.	Церахаўскі	27,1	1,7	15,8
58.	Дрысенскі	27,0	3,9	17,7
59.	Сеньненскі	26,7	0,6	9,1
60.	Полацкі	26,6	—	19,6
61.	Чашніцкі	26,4	—	35,2
62.	Крупскі	25,3	0,5	28,4
63.	Лепельскі	25,8	—	13,8
64.	Талачынскі	25,0	1,6	15,7
65.	Горацкі	23,8	0,9	24,5
66.	Лёзьнянскі	23,0	—	21,8
67.	Пятрыкоўскі	22,8	4,6	10,4
68.	Быхаўскі	19,4	2,3	11,4
69.	Хойніцкі	18,5	1,0	23,0
70.	Бешанковіцкі	17,5	—	22,3
71.	Чаўскі	16,6	1,9	28,2
72.	Вушацкі	14,6	—	25,5
73.	Чырвонапольскі	14,4	—	9,0
74.	Кармянскі	13,6	—	16,3
75.	Нараўлянскі	12,0	17,5	17,2
	Усяго па БССР	35,3	4,3	20,1

На 48 проц. звыш пляну

ДРЫСА. ДРЫСЕНСКАЯ МТС, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ РАЙКОМУ, ПА АСНОВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ МАС КАЛГАСЬНІКАЎ, ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК НА 148 ПРОЦ. (ПА СТАНОВІШЧЫ НА 5 КАСТРЫЧНІКА).

МТС ЗМАГАЕЦЦА ЗА ДАЛЕЙШАЕ АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ, ЗА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ І ЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ ІЛЬНУ.

ДЫРЭКТАР МТС — **КЛЯШЧОЎ.**
САКРАТАР ЯЧЭЙКІ КП(б)Б — **ШАКАЛІДА.**
СТАРШЫНЯ РАБАЧКОМУ — **ТКАЧЭНКА.**

Урокі першай пяціднеўкі кастрычніка

Першая пяціднеўка кастрычніка не дала патрэбнага зруху ў ходзе збожжазагатовак. Калі па 1 кастрычніка было загатоўлена 30,9 проц. гадавога пляну, дык па 5-га кастрычніка здано 35,3 проц.

Тэмпы загатовак паказваюць, што ва многіх раёнах работа дагэтуль ідзе рыўкамі. У пачатку месяца людзі сыпяць, не праяўляюць належнай энэргіі па разгортваньні кампаніі, а ў канцы месяца ўзварушваюцца, пачынаюць штурмаваць дапушчаныя прарывы.

Адсутнасьць сыстэматычнай, штодзённай барацьбы за збожжа асабліва адбіваецца на ходзе збожжазагатовак у пачатку месяца. Калі апошняя пяціднеўка верасьня дала пэўны зрух уперад, дык першая пяціднеўка кастрычніка зноў прынесла аслабленьне тэмпаў. За час з 25 па 30 верасьня паступіла 4.533 тоны, а за пэрыяд з 1 па 5 кастрычніка толькі 3.038 тон. Аслабленьне работы мы маем амаль па ўсіх сэктарох. Калгасы здалі 1.254 тоны замест 1.920 тон у мінулую пяціднеўку; адпаасобніка—1.784 тоны, замест 2.613.

Трэба адначыць вялікія посьпехі перадавых раёнаў, якія паказваюць узорныя тэмпы барацьбы за збожжа, якія на аснове разгортваньня масавай работы наблізіліся да поўнага выкананьня пляну. Да іх адносяцца Клімавіцкі, Лельчыцкі, Дзяржынскі, Камарынскі і Тураўскі раёны, якія загатовілі ад 60 да 70 проц. пляну. Пры захаваньні і ўзмацненьні дасягнутых тэмпаў, гэтыя раёны бязумоўна будуць першымі рапартаваць аб сканчэньні загатовак да кастрычніцкіх сьвят.

Раёны — Нараўлянскі, Кармянскі, Чырвонапольскі і Вушацкі, якія ўжо некалькі тыдняў «красуюцца» на чорнай дошцы, нічога не зрабілі, каб перабудаваць работу, каб ліквідаваць адставаньне. Яны і на гэты раз застаюцца на чорнай дошцы.

Зьвяртае на сябе ўвагу работа Бабруйскага раёну, які замест 26-га месца на 1-га кастрычніка, заняў 18 месца па 5-га кастрычніка. Бабруйскі раён па-баявому змагаецца за заваяваньне перадавых пазыцый на збожжазагатоўчым фронце.

Да кастрычніцкіх сьвят засталося менш месяца. Гэты кароткі пэрыяд павінен быць скарыстан для максымальнага фарсавань

Больш тавараў шырспажыву добрай якасьці

Гэтымі днямі рэдакцыяй «Зьвязда» была склікана нарада прадстаўнікоў прамысловых наркаматаў і прамкаапэрацыі БССР па пытаньні арганізацыі пераклічкі прадпрыемстваў і арцеляй на лепшую рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду ў справе разгортваньня гэрабу прадметаў шырокага спажываньня.

Нарада паказала, што далёка не ва ўсіх прадпрыемствах перабудавана работа партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый з тым, каб па-бальшавіцку змагацца за далейшае паляпшэньне матар'яльнага і культурна-бытавога становішча рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных нашай краіны.

Палепшаньне матар'яльна-бытавых умоў рабочае клясы — важнейшая задача. Выраб прадметаў шырокага спажываньня ёсьць баявы абавязак нашых прадпрыемстваў.

Як-жа з гэтай задачай спраўляюцца прамысловасьць і прамкаапэрацыя БССР? Лічбовыя даныя сьведчаць аб тым, што ў справе мабілізацыі мас па выкананьне апошніх пастаноў партыі і ўраду мала зроблена. Заданьне 3 кварталу прадпрыемствамі ўнаўнаркамлесу выкапана на 75,1 проц. Прадпрыемствы Наркамлёгпраму выкналі сваё заданьне на 95,4 проц.

Ах кіраўніцтва прамкаапэрацыі БССР, якая ў агульным ліку ўсяго шырспажыву займае 55 проц., партыя патрабавала даць прадукцыі ў 1932 годзе па 95,5 млн. руб. па цэнах 1927 г. З гэтым заданьнем прамкаапэрацыя з месяца ў месяц не спраўляецца па тэй прычыне, што дагэтуль не паладжана канкрэтнае кіраўніцтва арцелямі. Гадавое заданьне імі за 8 месяцаў выканана ўсяго толькі на 55,7 проц.

Зусім недапушчальнае становішча мы маем у справе ганчарных вырабаў. У гэтай галіне заданьне выкакана толькі на 18 проц. І гэта ў той час, як асноўным сыр-цом арцелі ганчарных вырабаў забясьпечаны поўнасьцю.

Ня выконваецца заданьне і арцелямі па рамонту абутку. Тэмпы іх работы надзвычай марудныя. Абутак закачыкаў валяецца па 2-3 месяцы. Усё гэта прывяло да таго, што заданьне за 8 месяцаў абутковымі арцелямі выканана толькі на 23,3 проц.

Прадстаўнік ад прамкаапэрацыі тав. **Лугоўскі** скардзіўся на прамысловыя прадпрыемствы, што яны не забясьпечваюць арцелі ўцілем. Прадстаўнік ад упаўнаважанага Наркамцяжпраму тав. **Калінін** апраўдваў невыкананьне праграмы тым, што нібыта на мэталізаводах ужо амаль няма адыходаў.

Падобныя разважаньні, бязумоўна, ня маюць ніякіх падстаў. Адыходы ёсьць на ўсіх прадпрыемствах, ёсьць яны і ў арцелях. Што перашкаджае іх скарыстаньню?

Многія гаспадарнікі вельмі мала аддаюць увагі разгортваньню работы ўцільцэхаў, падбору асартымэнтаў тавараў. Здолеў-жа завод «Камунар» (Менск) зглумніць 1.500 секачоў, абярнуўшы іх у брык. Бабруйскі камбінат выпусьціў 500 табурэтак, якімі толькі печы паліць, а больш нікуды яны ня годны.

Неабходна арганізаваць лепшае скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці. Прыдпрыемствы павінны па-бальшавіцку змагацца за скарыстаньне ўсіх адыходаў і, выконваючы свой прамфінплян, звыш пляну даць на мільёны рублёў тавараў шырокага ўжытку.

Вельмі дрэнна стаіць справа з прасоўваньнем тавараў шырокага ўжытку на рынках. Уліку, якая колькасьць тавараў ідзе ў горад і якая на вёску, у наркаматах няма. На гэта толькі прадстаўнік упаўнаркамлесу тав. **Кацнельсон** мог адказаць, што імі адпраўлена 78 проц. усяе прадукцыі шырспажыву па вёску і 22 проц. гораду.

Заводы ня цікавяцца куды іх тавары ідуць і які асартымэнт патрэбна выпускаць у першую чаргу. Толькі завод «Ударнік» паладжвае прасоўваньне сваіх тавараў непасрэдна да пакупца, калгасьніка і працоўнага селяніна — аднаасобніка. Гэтым самым заводзкія арганізацыі дабіліся паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Час ужо зразумець, што баявым лёзунгам дня зьяўляецца — **даць больш тавараў шырспажыву, паўней і шырэй задавальняць патрабаваньні шырокіх мас рабочых і калгасьнікаў. Няўхільнаму росту сацыялістычнай вытворчасьці — магутны і поўнакроўны таваразварот!**

Гэтыя задачы асабліва выступаюць перад намі ў сувязі з апошнім рашэньнем партыі і ўраду аб збожжа і жывёлазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю. Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б падкрэсьліў **«далейшае разгортваньне таваразвароту памён горадам і вёскай, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, уздым вытворчай актыўнасьці калгасаў і працоўных сялян адкаасобнікаў і стварэньне гэтым самым вялізарных дадатковых рэсурсаў для паляпшэньня забесьпячэньня рабочых і працоўных вёскі».**

У АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТАЙ ВАЖНЕЙШАЙ ПАСТАНОВЫ ГАЗЭТА «ЗЬВЯЗДА», РАЗАМ З ЦСПСБ, УПАЎНАРКАМЦЯЖПРАМУ, НАРКАМЛЕСУ, НАРКАМАТАЎ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І ПРАМКААПЭРАЦЫЯЙ АБВЯШЧАЮЦЬ УСЕБЕЛАРУСКІ МІТЫНГ-ПЕРАКЛІЧКУ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АРЦЕЛЯЙ. ПЕРАКЛІЧКА ПАВІННА МАБІЛІЗАВАЦЬ ШЫРОКІЯ МАСЫ РАБОЧЫХ, УЗЬНЯЦЬ ІХ АКТЫЎНАСЬЦЬ У БАРАЦЬБЕ ЗА ЛЕПШЫ УЦІЛЬЦЭХ, БРЫГАДУ І АРЦЕЛЬ ПА ВЫКАНАНЬНІ ЗАДАНЬНЯ ВЫПУСКУ ПРАДМЕТАЎ ШЫРСПАЖЫВУ ДОБРАЙ ЯКАСЬЦІ.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны дабіцца поўнай рэалізацыі прапаноў рабочых па лепшым скарыстаньні адыходаў вытворчасьці. **Перад аб'яднаньнямі стаіць задача вылучыць фонды для прэміяваньня заводаў, цэхаў і асобных ударнікаў, за разгортваньне выпуску тавараў шырспажыву, за патрэбны асартымэнт і якасьць прадукцыі.**

Мітынг-пераклічка павінен зьвіцца вагаром у барацьбе за паляпшэньне матар'яльнага і культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. **Мы павінны дабіцца, каб у аснову работы заводзкіх арганізацый былі пакладзены 6 гістарычных умоў тав. Сталіна.** Уцільцэхі павінны быць забясьпечаны пастаяннымі кадрамі рабочых.

Справай гонару кожнай цэнтральнай, раённай і фабрычна-заводзкай шматтыражкі будзе, калі яны са дня ў дзень, паказваючы лепшыя прыклады работы, выкрываючы коснасьць і бюракратызм, дабіваюцца поўнага выкананьня пляну па выпуску тавараў шырспажыву.

Гэта пачынаньне павінна быць падхоплена партыйнымі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі. **Толькі безнадзейны апартуніст не зразумее тэй вялізарнай палітычнай задачы — барацьбы за бесьперапыннае паляпшэньне матар'яльнага і культурна-бытавога становішча рабочага і калгасьніка.**

Выпусьціць больш тавараў шырокага спажываньня, палепшыць якасьць — восьмая задача, якая павінна заняць цэнтральнае месца ў рабоце кожнага гаспадарніка, партыйна-прафсаюзнага работніка і кожнага рабочага.

Лепшыя прыклады работы неабходна перапісьці праз друк у адстаючыя прадпрыемствы. **Кампанейшчына павінна быць заменена ўпартай барацьбой за выкананьне якасных і колькасных паказальнікаў пляну выпуску прадметаў шырспажыву.**

НОВЫ КВАРТАЛ І СТАРЫЯ НЕПАЛАДКІ

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). У першыя дні 4-га кварталу вытворчая праграма па выпуску бульбакапалак заводам «Чырвоны мэталіст» была выканана. Але гэта ні ў якім разе нельга адносіць за лік узмацненьня кіраўніцтва, зьнішчэньня цэхавых непаладак. Выкананая праграма за кошт скарачэньня заданьня на **18 шт.** у дзень.

Зборачныя бульбакапалак могуць выпусьціць значна больш машын, але гэтаму перашкаджае ліцейны цэх. Ён несвоячасова падае такарнаму цэху шасьцярэнкі. Зборачным прыходзіцца шмат траціць часу на атрыманьне дэталяй.

Выпуску бульбакапалак (з мэтай пакрыцьця запазычанасьці за мінулыя месяцы) таксама перашкаджае загатоўчы цэх, які ня даў патрэбнай колькасьці крышак плянэтнай скрыні. У выніку, 3-га кастрычніка другая зьмена сабрала замест 15 плянэтных скрынь — 7.

Плугоў «Эбергарда» замест **6 шт.** выпушчана **5.** Прычынай гэтаму зьяўляюцца нікуды ў рабоце цэхаў. Загатоўчы цэх не падае зборачнаму патрэбнай колькасьці лемехаў. Такарны ня даў кулакоў палявой восі і вінтоў цягі. З-за недахвату гэтых дэталяй засталіся нескончанымі **3 плугі.**

У затрыманьні дэталяй вінаваты майстры такарнага цэху **Андрзеў, Шэрэнга,** і адміністрацыя загатоўчага цэху.

Ня выконваецца заданьне па выпуску корнярэзак. Замест 63 машын выпускаецца **50.** Праграму выпуску корнярэзак зрывае таксама ліцейны цэх. Зробленыя ім пажавыя дыскі аказаліся бракаванымі. Усё гэта выклікае лішнюю трату часу на падгонку і абрубку дэталяй.

Макухадрабілак **за 3 дні замест 66 выпушчана толькі 42,** у той час, як поўфабрыкатамі і патрэбнымі дэталямі завод поўнасьцю забясьпечан. Наогул, выпуск макухадрабілак зьяўляецца забытым участкам работы заводзкіх арганізацый. Кваліфікаваныя рабочыя перакінуты на іншыя работы, а на зборцы гэтых машын засталіся фабзавучнікі.

Прыведзеныя факты з усёй відавочнасьцю **сьведчаць аб тым, што прычын для невыкананьня вытворчай праграмы на заводзе няма.** Асноўным тормазам зьяўляюцца «дробязі», цэхавыя непаладкі і адсутнасьць пэрсанальнай адказнасьці за працэсы работы.

ВЫГЛЯД АСНОЎНЫХ ЦЭХАЎ ЯРАСЛАЎСКАГА ЗАВОДУ СЫНТЭТЫЧНАГА КАЎЧУКА

165 ТЫС. ТОН БУЛЬБЫ—ЛЕНІНГРАДУ

БУЛЬБУ З ПОЛЯ—НА АДГРУЗАЧНЫЯ ПУНКТЫ!

Як нельга праводзіць загатоўкі

ЛЁЗНА. (Наш кар.). Плян загатовак бульбы па Лёзьнянскім раёне складае 5.700 тон, з якіх райспажыўсаюз павінен загатовіць 1.800 тон, кантора БПГ—1.600 тон, Янавіцкі завод—2 тыс. тон, Багушэўскі завод—300 тон. Да кожнай арганізацыі і прадпрыемства прымацавана гэўная колькасьць сельсаветаў.

На 8-га кастрычніка па сыстэме райспажыўсаюзу загатоўлена і адгружана 58,7 проц. пляну, канторай БПГ—55 проц., а Янавіцкі завод, паводле яго вестак, загатовіў на 5-га кастрычніка толькі... 55 тон—2,8 проц. У сапраўднасьці-ж загатоўлена значна больш. Справа ў тым, што ўлік здаванай бульбы пастаўлен вельмі дрэна. Гэтым стараецца поўная лазейка для розных злачынстваў.

Янавіцкі завод дапусьціў рад агіднасьцяй пры прыёмцы бульбы. Напрыклад, Сутоцкі пункт прымае бульбу з 10 проц. скідкай, якасьць яе ня ўлічваецца. Завод тлумачыць гэта тым, што бульба прызначаецца для тэхнічнай пераапрацоўкі. Разьлікі са здатчыкамі бульбы ня робяцца на месцы. Таму сляпе імкнуцца здаваць бульбу абы куды, толькі ня Янавіцкаму заводу.

Апрача таго, завод механічна падышоў да калгасаў і аднаасобных гаспадарак пры вызначэньні месца здачы. Бліжэйшыя да заводу пункты буртавалі бульбу па месцы, а далёкія вазілі на завод.

Справа аб «дзейнасьці» загатоўцаў з Янавіцкага заводу, на аснове пастановы Лёзьнянскага РВК, перадана пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Прывядзем рад фактаў, якія сьведчаць аб нездавальняючым становішчы з загатоўкаю бульбы. У калгасе «Серп і молат», Караленьскага сельсавету, ляжыць у куні калі шашы 45 тон бульбы. МТС, паводле дагавору, абавязалася яе вывезьці, але ня вывозіць, бо «машыны заняты». Машыны хадзяць у Смаленск і іншыя гарады па асабістых і «службовых» справах розных асоб і арганізацый. Гэтыя паездкі для МТС выгаднейшы, чым возка бульбы—за іх плацяць па 15 руб. за гадзіну.

У калгасе «Маяк сацыялізму», Стасеўскага сельсавету, ляжыць 73 тоны загатоўленай бульбы. Гэты калгас абслугоўваецца МТС. Сувязь добрая—шаша, але МТС не клапоціцца аб вывазцы бульбы.

Ёсьць яшчэ рад недахопаў, якія тармозяць адгрузку пралетарскім цэнтрам.

У Высачанскім сельсавеце сельстаўтавариства і рабкоп фабрыкі імя **Карла Маркса** ў парадку самазагатовак купілі 70 тон бульбы, а сельсавет уключыў гэту колькасьць у лічбу... выкананьня цэнтралізаванага пляну.

Агідна праводзіць самазагатоўкі віцебскае аддзяленьне «Белгандлю». Прадстаўнік аддзяленьня прывёз у калгас «Авангард», Кабыліцкага сельсавету, 200 пар абутку, бялізну і ватоўкі ў абмен па вагон бульбы. Калгас, ня выкапаўшы пляну цэнтралізаваных загатовак, адгрузіў «Белгандлю» адзін вагон, але кантора Белпладагароднины не дазволіла адправіць яго. За спробу тавараабмену загатоўчыкі з «Белгандлю» павінны быць пакараны.

Ёсьць выпадкі, калі калгасам замест наўных грошай выдаюцца чэкі ў мясцовыя аддзяленьні Дзяржбанку. Белпладагароднина выдае чэкі ў той час, як грошай на яе рахунку няма. Такія выпадкі трэба неадкладна ліквідаваць. Ні адной капейкі заплачанасьці здатчыкам!

А. Мікуцкі.

Раўняцца па калгасу імя Будзеннага

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). Паводле вестак райза, на 5-га кастрычніка аднаасобны сэктар выканаў 90,3 проц. пляну капаньня бульбы; калгасы ўбралі 93,4 проц. Але паміж капаньнем і адгрузкай існуе вялікі разрыў.

Да 5-га кастрычніка прымацаваныя да канторы Белпладагароднины сельсаветы здалі толькі 19 проц. пляну, або 247 тон. На сыстэме спажывецкай кааперацыі здана 414 тон, пры заданьні ў 1910 тон.

У радзе калгасаў работа па загатоўках зусім не арганізавана. Нізавыя партыйныя і камсамольскія арганізацыі і сельсаветы ня бачаць, што бульба цячэ на прыватны рынак, што кулацка-заможная частка хавае яе. Возьмем, напрыклад, **калгас імя Молатава,** Лапіцкага сельсавету, які павінен адгрузіць 95 тон. Не адгружана ні аднаго фунта. Праўленьне калгасу разгортвае гандаль бульбай на рынку і не гварачае ўвагі на выкананьне пляну загатовак. Нічога ня робіцца па адгрузцы і ў калгасе імя Энгельса, гэтага-ж сельсавету.

Ня гледзячы на тое, што абодва калгасы знаходзяцца ля самай чыгункі, што бульбу можна проста з поля грузіць у вагоны, мясцовыя арганізацыі пакінулі адгрузку бяз увагі.

Добры ўзор работы паказвае **Сталінскі** сельсавет, які выканаў 45 проц. пляну адгрузкі.

Таксама па-ўдарнаму здае бульбу калгас **імя Будзённага,** Крыўскага сельсавету. На сходах палявodных брыгад, на пасяджэньні праўленьня былі выпрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па капаньні і адгрузцы бульбы з поля па пункты. З кожнай палявой брыгады вылучаны спэцыяльныя групы для штодзённай вожкі. Кожнаму возчыку да

Узоры бальшавіцкай работы

ДУБРОЎНА. КАЛГАС «УДАРНІК», РАСТКОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЎ УБОРКУ БУЛЬБЫ І ЎЖО ПЕРАВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ ПА БУЛЬБАЗАГАТОЎКАХ. ЗГОДНА ПЛЯНУ, КАЛГАС ПАВІНЕН БЫЎ ЗДАЦЬ 120 ЦЭНТН. БУЛЬБЫ ФАКТЫЧНА-Ж ЗДАНА 124 ЦЭНТ. ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА ГЭТЫМ КАЛГАСЕ ВЫКАНАН НА 95 ПРОЦ. ЗА РАЗ КАЛГАС ПРЫСТУПІЎ ДА АПРАЦОЎКІ ЛЬНУ.

КАЛГАС «УДАРНІК» ІДЗЕ ПЕРШЫМ У СЕЛЬСАВЕЦЕ ПА ЎСІХ ЗАГАТОЎКАХ. ГЭТЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ КАЛГАС ДАБІЎСЯ ДЗЯКУЮЧЫ ЎВЯДЗЕНЬНЮ ПРАВІЛЬНЫХ НОРМ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ, ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ І ЎРАЎНІЛАЎКІ. КАЛГАС «УДАРНІК» ПАКАЗВАЕ БАЛЬШАВІЦКІЯ ПРЫКЛАДЫ РАБОТЫ.

(БЕЛТА).

Чыгунка затрымлівае падачу паражняка

СЛУЦАК. (Наш кар.). Слуцкая міжраённая кантора Белпладагароднины павінна адгрузіць Ленінграду да 20 кастрычніка 4.570 тон бульбы.

Між тым адгрузка ідзе зусім дрэнна. На 5-га кастрычніка адгружана 1.490 тон — 32,5 проц. агульнага заданьня. У той час, як Слуцкі раён ужо адправіў 501 тону — 60 проц. заданьня, у астатніх раёнах, якія абслугоўваюцца Слуцкай міжраённай канторай (Чырвона-Слабодзкі, Капыльскі, Старобінскі), загатоўкі—ідуць вельмі павольна. Гэтыя раёны адгрузілі за ўвесь час 27,5 проц. данага пляну.

Чыгунка несвоячасова, а часам зусім не падае вагонаў пад пагрузку. 6 кастрычніка раніцай прыбылі на базу Белпладагароднины шмат фурманак з бульбай—з далёкіх раёнаў (Старобіна, Чырвонай Слабады, Капыля). З-за непадачы вагонаў калгасьнікі і аднаасобнікі былі прымушаны чакаць амаль цэлы дзень. На гэтай-жа базе ўжо скапілася каля 4 вагонаў бульбы, высыпанай з машынаў.

Вагоны, якія прыбываюць з грузам на станцыю Слуцак, разгружаюцца несвоячасова, што затрымлівае пагрузку бульбы.

Здадчыкі прадукцыі абіваюць кожны дзень парогі канторы Белпладагароднины, каб атрымаць грошы. Але-ж атрымліваюць адзін адказ: «Няма грошай сёньня, прыдзеце заўтра».

Аддзяленьне Слуцкага Дзяржбанку, па перакор дырэктывам не выдае канторы БПГ патрэбнай колькасьці грошай.

Б. Х.

Здана бульбы на загатоўчы пункт (калгас «Чырвоная Зьмена», Пухавіц. р.)

ДА ВЫНІКАЎ XII ПЛЕНУМУ ВККІ

Рэзалюцыя XII пленуму ВККІ мае вялізарнае значэньне для ўсяго міжнароднага рэвалюцыйнага руху.

З XI да XII пленуму ВККІ мінула 16 месяцаў. За гэты час сусьветны эканамічны крызіс ва ўсіх капіталістычных краінах пяўхільна ўсё паглыбляўся і абвастраўся. Усе мерапрыемствы капіталістычных урадаў, ставячыя сваёй мэтай зьмякчэньне крызісу, прыводзілі і прыводзяць толькі да далейшага паглыбленьня крызісу. Усе прадказаньні буржуазных і сацыял-дэмакратычных «вучоных» і варажбітак аб блізкім канцы крызісу аказаліся няправільнымі. Меў рацыю Камуністычны Інтэрнацыянал.

Папаваньне манапалістычнага капіталу, на ўмовах агульнага крызісу капіталізму, надзвычай затрудняе зжываньне эканамічнага крызісу звычайным для капіталізму шляхам свабоднай канкурэнцыі. Зацягваньне эканамічнага крызісу вядзе да далейшага росту рэвалюцыйнага ўздыму, да далейшага абвастраньня ўсіх супярэчнасьцяй імпэрыялістычнай сыстэмы. Зараз ужо з надзвычайнай навочнасьцю пацьвердзілася правільнасьць бальшавіцкай ацэнкі трэцяга пэрыяду пасьляваеннага крызісу капіталізму, як пэрыяду расхіваньня і канца адноснай стабілізацыі капіталізму, як пэрыяду вялікіх сутычак паміж клясамі і дзяржавамі.

Рост рэвалюцыйнага ўздыму мас прымушае імпэрыялістаў сьпяшацца з пошукамі новых рынкаў збыту, крыніц сыроду і сфэр прыкладэньня капіталу. Абвастраньне супярэчнасьцяй паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі, [illegible] ўсё англа-амэрыканскіх супярэчнасьцяй, але ня ў меншай меры і супярэчнасьцяй паміж ПАЗШ і Японіяй, Францыяй і Італіяй, Германіяй і Францыяй, Германіяй і Польшчай, вядзе **да новай сусьветнай імпэрыялістычнай вайны,** галоўным вогнішчам якое цяпер стаў Далёкі Усход.

Імпэрыялісты разглядаюць вайну, як сродак выхаду з крызісу. Гэты выхад, пры захаваньні капіталістычнай сыстэмы, мысьліцца шляхам ваеннай перамогі аднэй групы імпэрыялістаў над другой, шляхам зьнішчэньня і ограбленьня аднэй часткі канкурэнтаў другою, шляхам захвату рынкаў і тэрыторый пераможаных краін.

Перамога савецкай рэвалюцыі ў значнай частцы Кітаю, вялізарны рост і ўмацаваньне кітайскай Чырвонай арміі, паўстаньні прыгнечаных народаў супроць імпэрыялістаў у самых адсталых куткох калёніяльнага сьвету, рэвалюцыя ў Гішпаніі, эканамічныя і палітычныя стачкі, што спалучаюцца з сялянскімі паўстаньнямі, крывавыя бойкі рабочых з фашыстамі ў Германіі, рост руху шырокіх мас супроць вайны ва Францыі, вялізарныя эканамічныя і палітычныя стачкі ў Чэха-Славакіі, Бэльгіі, Англіі і іншых краінах, рэвалюцыйныя выступленьні сялян у Японіі, Індыі, Югаславіі і рост ушыву і колькасьці кампартый паказваюць, што рэвалюцыйны рух ва ўсім капіталістычным сьвеце набывае ўсё больш шырокія і вострыя формы, падводзячы некаторыя краіны (Польшча, Германія) шчыльна да рэвалюцыйнага крызісу.

Супроць узрастаючых сіл рэвалюцыі мабілізуюцца сілы контр-рэвалюцыі. Арганізуюцца фашысцкія атрады грамадзянскай вайны. Уводзяцца ў сыстэму белы тэрор, правакацыя, расстрэлы бастуючых і дэманстрантаў, роспуск і разгром рабочых дэманстрацый. Буржуазная «дэмакратыя» ўсё больш уступае месца адкрытай фашысцкай дыктатуры. Цяперашні ўрад у Германіі зьяўляецца аднэй з форм фашысцкай дыктатуры. Тым ня менш устанаўленьне фашысцкай дыктатуры азначае сабой не ўзмацненьне, а аслабленьне германскай буржуазіі.

Асноўны працэс, што адбываецца зараз ва ўсіх капіталістычных краінах—гэта рост сіл рэвалюцыі. Пад ушывам росту рэвалюцыйнага ўздыму, нават у краінах, у якіх фашысцкая дыктатура ўстанавілася да пачатку цяперашняга эканамічнага крызісу (Польшча, Італія, Югаславія), **намячаецца ўжо працэс распаду фашызму.**

На аснове ўсіх гэтых даных XII пленум ВККІ прызнаў, што становішча сусьветнага капіталізму ў цэлым і становішча ўнутры раду буйнейшых імпэрыялістычных краін становіцца ўсё больш **хісткім, няўстойлівым,** што адносная стабілізацыя капіталізму, наступіўшая пасьля паражэньня рабочае клясы ў радзе эўрапэйскіх краін у першым туры рэвалюцый і войнаў, **закончылася,** што ўперадзе вялізарныя сутычкі паміж клясамі і дзяржавамі, войны і рэвалюцыі.

Больш таго, XII пленум ВККІ канстатаваў, што ў пэўных надзвычай важных вузлавых пунктах імпэрыялістычнай сыстэмы антаганістычныя сілы ўжо разьвязваюцца для сутычкі.

Асноўнае ў гэтай ацэнцы міжнароднага становішча, якую даў XII пленум ВККІ, заключаецца імення ў канстатаваньні таго факту, што **адносная стабілізацыя капіталізму скончылася,** што ў цяперашні момант **адбываецца пераход** да буйных гвалтоўных сутычак паміж клясамі і дзяржавамі, **пераход да другога туру рэвалюцый і войнаў.**

Камуністычны Інтэрнацыянал прыкладае ўсё намаганьні, каб яшчэ мацней зьвязацца з масамі, **узначаліць масы, арганізаваць барацьбу мас і ўзьняць яе на ўзровень барацьбы за ўладу.** Імення таму Камуністычны Інтэрнацыянал ставіць зараз сваёй асноўнай задачай **барацьбу супроць наступленьня капіталу і рэакцыі, супроць надыходзячай новай імпэрыялістычнай вайны і навісшай над СССР небясьпекі ваеннай інтэрвэнцыі.**

Кашэц капіталістычнай стабілізацыі, шпаркае нарастаньне прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу ў радзе капіталістычных краін, усё цяперашняя новая міжнародная абстаноўка паказвае, што **тэрміны насьпяваньня рэвалюцыйнага крызісу шпарка скарачаюцца.**

Асноўнай умовай, якая забясьпечвае посьпех пераможнай пралетарскай рэвалюцыі, зьяўляецца сама рэвалюцыйная рабочая кляса, яе сьвядомасьць, арганізаванасьць, адданасьць, баявая падрыхтоўка, гатоўнасьць ісьці па ахвяры, паяўнасьць у авангардзе яе сапраўды бальшавіцкай партыі, умеючай узначаліць масы, быць заўсёды наперадзе мас, скарыстаць сытуацыю, даць своячасова правільныя лёзунгі, арганізаваць перамогу. Бяз гэтых умоў, без такой падрыхтоўкі рабочае клясы рэвалюцыйная сытуацыя ня можа даць перамогі пралетарыяту. Таму камуністычныя партыі ў гэтых умовах ставяць сваёй задачай рыхтаваць пралетарыят да гэтага моманту, ня ўпусьціць яго, поўнасьцю яго скарыстаць.

Асноўная стратэгічная задача, якая стаіць перад усім Камуністычным Інтэрнацыяналам і перад кожнай яго сэкцыяй у паасобку, ёсьць **заваяваньні большасьці рабочае клясы для барацьбы за дыктатуру пралетарыяту.** У некаторых краінах (Кітай, Гішпанія, Германія, Польшча і г. д.) гэта задача ўжо павінна быць вырашана па працягу самага кароткага адрэзку часу. Яна павінна быць вырашана шляхам умацаваньня сувязяй камуністычнай партыі з самымі шырокімі масамі рабочай клясы, шляхам упартай работы ў рэфармісцкіх прафсаюзах і арганізацыі адпору наступленьню капіталу на зарплату і правы рабочых. Камуністы — адзіныя, якія бяруць на сябе абарону штодзённых патрэб мас, узьнімаючы іх палітычную актыўнасьць і падводзячы іх да барацьбы за ўладу. Адзначаючы яшчэ невыстарчальнае разьвіцьцё стачачнай барацьбы ў Германіі, XII пленум ВККІ ўказаў на вялізарнае значэньне посьпехаў германскага пралетарыяту ў антыфашысцкай барацьбе, якая набывае часамі вельмі вострыя формы вулічных сутычак, і на значэньне посьпехаў КПГ у яе барацьбе супроць сацыял-дэмакратыі, за большасьць рабочае клясы.

Пленум адзначыў таксама вялізарнае значэньне работы кампартыі Польшчы і Чэха-Славакіі ў справе мабілізацыі мас у часе апошніх стачак і сялянскіх выступленьняў. Ён адзначыў таксама вялізарную важнасьць посьпехаў баўгарскай кампартыі, якая ўжо вядзе за сабой большасьць рабочае клясы і значныя пласты сялянства.

Завяваньне большасьці рабочае клясы для рэвалюцыі можа быць ажыцьцёўлена толькі ў рашучай б[illegible] супроць сацыял-дэмакратыі, толькі шляхам падрыву масавага ўплыву гэтай партыі, якая зьяўляецца галоўнай сацыяльнай апорай буржуазіі. Сацыял-дэмакратыя ідзе на новыя «левыя» маневры. Яна грае словамі аб камунізьме. Яна месцамі нават заклікае да масавай палітычнай стачкі. Камуністы раскрываюць усю хлусьню і ашуканства сацыял-дэмакратычнай фразы аб сацыялізьме, даказваючы, што імення за ёю тоіцца новая спроба падтрыманьня капіталізму для выратаваньня яго ад пралетарскай рэвалюцыі. «Левыя» манэўры сацыял-дэмакратыі паказваюць, што ў шырокіх масах падарваны ўжо ілюзіі пакоп капіталізму і буржуазнай дзяржавы. У адпаведнасьці з пастановамі XII пленуму ВККІ, **на аснове тактыкі адзінага фронту,** камуністы будуць мабілізоўваць масы, узьнімаць іх самаўпэўненасьць і падводзіць іх да барацьбы за дыктатуру пралетарыяту. Канфіскацыю сродкаў вытворчасьці пралетарскай дзяржавай, як сапраўдную іх нацыяналізацыю, камуністы проціставяць сацыял-дэмакратычным прапановам аб «нацыяналізацыі» фабрык і заводаў буржуазнымі ўрадамі.

Камуністычны Інтэрнацыянал лічыць адпэй з асноўных і важнейшых сваіх задач падрыхтоўку і ракторгваньне масавай палітычнай стачкі. Пры гэтым перад кампартыямі Германіі і Польшчы Камуністычны Інтэрнацыянал ставіць задачу падрыхтоўкі **ўсеагульнай палітычнай стачкі** пад кіраўніцтвам камуністаў.

XII пленум адзначыў у рабоце камуністычных партый рад вялікіх слабасьцяй. Камуністычныя партыі яшчэ не скарысталі поўнасьцю ўсёй сарыючай абстаноўкі для арганізацыі эканамічных баёў. Яны ў цэлым радзе выпадкаў ня здолелі ўзьняць масы на палітычную стачку супроць наступленьня фашызму і капіталізму. Посьпехі камуністычных партый імпэрыялістычных краін ня здолелі прыпыніць транспарт баявых прыпасаў у Японію. Посьпехі камуністычных партый капіталістычных краін у барацьбе супроць наступленьня капіталу і грабежніцтва рабочых мас, супроць фашызму і рэакцыі, супроць імпэрыялістычнай вайны далёка яшчэ невыстарчальны. XII пленум ВККІ заклікаў кампартыі да такога ўзмацненьня сваёй работы, каб у найкарацейшы тэрмін зжыць гэтыя недахопы.

XII пленум ВККІ паказаў, што Камуністычны Інтэрнацыянал вельмі вырас і ўмацаваўся. Ва ўсіх буйнейшых краінах камуністычныя партыі ўжо канчаткова склаліся як бальшавіцкія партыі. Гэтым цяперашні пэрыяд пераходу да новага туру рэвалюцый і войнаў адрозьніваецца ад першага туру імпэрыялістычных войнаў і рэвалюцый.

Таму тыя баі, да якіх зараз падыходзяць Камінтэрн, будуць значна больш сур'ёзнымі і ў радзе краін рашаючымі баямі.

Камуністычны Інтэрнацыянал вырас і ўмацаваўся ў барацьбе за бальшавіцкую лінію, супроць правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва, супроць трацкізму, зіноўеўшчыны, бухарынщчыны, брандлерыянства, лёўстанізму (Амэрыка) і многіх іншых рознавіднасьцяй правага і «левага» апартунізму.

XII пленум ВККІ заклікаў увесь КІ да далейшай рашучай барацьбы як супроць правых тэндэнцый у некаторых партыях (Эмбэр-Дро), так і супроць «левых»-сэктанскіх (ПАЗШ) і анарха-сындыкалісцкіх (Гішпанія) тэндэнцый, а таксама супроць спроб аб'яднаньня ўсіх асколкаў розных апазыцый пад «ідэйным» кіраўніцтвам Троцкага (Польшча).

Заклікаючы працоўныя масы да самай шырокай прапаганды вялікіх сацыялістычных дасягненьняў СССР і да ўсямернага падтрыманьня бальшавіцкай палітыкі УсеКП(б), заклікаючы кучыцца на вялізарным вопыце рэвалюцыйнага знаганьня УсеКП(б), XII пленум ВККІ выказаў цьвёрдую ўпэўненасьць, што ў надыходзячых вялікіх клясавых бойках камуністы будуць сапраўднымі кіраўнікамі мас у барацьбе за ўладу.

(«Правда»).

ПРАДВЫБАРЧАЯ БАРАЦЬБА Ў ГЕРМАНІІ

РАЗБРОД У ЛЯГЕРЫ ГІТЛЕРА

БЭРЛІН, 11. Выбарчая барацьба разгортваецца марудным тэмпам. З буржуазных партый найбольшую актыўнасьць разьвівае такуль партыя нацыяналістаў. Гэта партыя, якая цалкам падтрымлівае палітыку Папэна, ужывае ўсе намаганьні, каб прыцягнуць галасы дробна-буржуазных выбаршчыкаў. На гэтай глебе паміж нацыяналістамі і гітлераўцамі разгортваецца жорсткая барацьба.

У Мюнхене адбылася агульна-германская нарада прапагандыстаў нацыянал-сацыялістычнай партыі. Як паведамляе «Тэгліхэ рундшау», прапагандыстам была дана дырэктыва накіраваць галоўны агонь супроць нацыяналістаў, асабліва падкрэсьліваючы ў часе выбарчай кампаніі «сацыялістычныя» ўстаноўкі нацыянал-сацыялістаў, і намагчы ўсе сілы да таго, каб прабрацца ў рабочыя масы.

На гэтай нарадзе Гітлер выступаў з прамовай, у якой усяляк даказваў, што справы нацыянал-сацыялістаў ідуць угору.

«Існуюць дзьве магчымасьці,—сказаў Гітлер,—або нам дадуць уладу, або нам яе не дадуць. У апошнім выпадку ўрад будзе раздушан магутнасьцю нашага руху. Супрацьўленьне, якое вам цяпер аказваюць,—гэта апошнія намаганьні аб'яднанага працыўніка перад рашаючай схваткай».

У другой заяве, зробленай супрацоўніку рымскай газэты «Тэверэ», Гітлер, жадаючы аднавіць сваю пахіснутую рэпутацыю ў італьянскіх фашыстаў, хвальліва сказаў:

«Пераход да нас улады пасьля перавыбараў нямінучы. Мы зможам бязьлітасна размалоць вораг ацькаўшчычы. Аднак я гатоў працягнуць руку тым нашым ворагам, якія стануць пад нашымі сьцягамі служыць велічы нашай бацькаўшчыны».

Паведамляючы аб гэтай заяве, «Фосішэ цэйтунг» заяўляе: «Мяркуючы па ўсім, што робіцца ў лягеры Гітлера, яму-б належыла, па меншай меры, не сьпяшыць з пагрозамі «размалоць» сваіх праціўнікаў. Калі наогул хто-небудзь будзе размолат, то ў першую чаргу сам Гітлер».

Партыя цэнтру рыхтуецца выступіць з вялікай праграмай, якую яна мае намер процінаставіць урадавай праграме.

Як паведамляе орган партыі цэнтру «Кельнішэ фольксцэйтунг», лідэр партыі прэлат Кас выказаў у Мюнстэры прамову, у якой выклаў патрабаваньні цэнтру. Газэта ўказвае, што ў асноўным партыя цэнтру будзе адстойваць прынцыпы парлямантарызму і ў сваіх прапановах з поваду прускай рэформы і зьмены канстытуцыі будзе настойваць на абмежаваньні права прэзыдэнта Газэта заўляе, што праграма партыі цэнтру расьсее апошнія ілюзіі аб магчымасьці якога-небудзь супрацоўніцтва паміж гэтай партыяй і ўрадам.

***

Прадвыбарчыя манэўры буржуазных партый адлюстроўваюць барацьбу розных груп германскага капіталу за лепшае выкарыстаньне фашысцкай дыктатуры ў інтарэсах далейшага аграбленьня шырокіх мас.

Характэрным момантам прадвыбарчай кампаніі зьяўляецца барацьба паміж нацыяналістамі і гітлераўцамі, якая ўсё больш разгортваецца. Ніякія хвальлівыя заявы Гітлера ня могуць утаіць факту разброду нацыянал-сацыялістычнага руху.

Праграмнае выступленьне партыі цэнтру, якое рыхтуецца, яўна разьлічана на тое, каб перахапіць у гітлераўцаў і нацыяналістаў галасы дробна-буржуазных выбаршчыкаў.

***

БЭРЛІН, 12. Выбары, якія адбываліся ў маленькай усходня-прускай абшчыне Гердаўэн, даюць той-жа малюнак, што і рад іншых апошніх абшчынных выбараў: слабая актыўнасьць выбаршчыкаў, значныя страты нацыянал-сацыялістаў, вялікія страты сацыял-дэмакратаў і іншых буржуазных партый і **адносна буйны посьпех камуністаў.**

Прыводзім разультаты гыбараў разам з данымі аб апошніх выбарах у рэйхстаг: кам партыя—170 галасоў (217), сацыял-дэмакраты—592 (898), нацыянал-сацыялісты—483 (1.074), буржуазны сьпіс—464 (213).

Нацыянал-сацыялісты пачалі новы тэрарыстычны паход супроць рабочых. У Бэрліне, у раёне Моабіт, забіт нацыянал-сацыялістамі рабочы Пакамоўскі; у раёне Нейкельн нацыянал-сацыялісты параніл аднаго рабочага, у раёне Целендорф яны напалі на сход чырвоных фізкультурнікаў, але ім быў дан належны адпор. Адзін рабочы фізкультурнік паранен. З боку нацыянал-сацыялістаў паранена некалькі чалавек.

У Рэйнскай вобласьці, у вёсцы Лордорф, нацыянал-сацыялісты забілі 20-гадовага рабочага.

НЕПАКОЙ У БЭРЛІНЕ

БЭРЛІН. Паездка Эрыё ў Лёндан разглядаецца тут як «самазапрашэньне» францускага прэм'ер-міністра, выкліканае паведамленьнем ангельскага пасла ў Парыжы, што ангельскія ўрадавыя колы разглядаюць нямецкі адказ, як «узбадзёраньне», якое пабуджае ангельскі ўрад заставацца пры сваім пляне скліканьня канфэрэнцыі. Тут думаюць, што Эрыё прыложыць усе намаганьні, каб адгаварыць Макданальда ад мысьлі аб скліканьні канфэрэнцыі або прынамсі паспрабуе дасягнуць з ім папярэдняй згоды. Мяркуюць, што Эрыё са здавальненьнем пайшоў-бы таксама на адкрытую дэманстрацыю англа-францускай дружбы. Асабістая гутарка Эрыё з Макданальдам і Саймонам, відавочна, зьвязана таксама з «новым» францускім плянам гарантыі бясьпекі і разьбраеньня, аб чым сьведчыць прамова Эрыё ў Кемры, у Эльзасе. Тут думаюць, што гутарка ідзе аб камбінацыі паміж плянам Тард'е і жэнэўскім пратаколам.

Зразумела, што тутэйшыя палітычныя колы не здаволены англа-францускай сустрэчай. Друк нацыяналістаў гаворыць аб новай «патаемнай гульні» Францыі. Якраз прыязныя Францыі колы сёньня са страхам адзначаюць абвастрэньне з выключнай шпар касьцю германска-францускіх адносін. Шмат гадовы парыскі карэспандэнт «Бэрлінэр тагеблат» апісвае ўзрастаючы варожы настрой Францыі да Германіі, «Бэрзэл кур'ер» адзначае, што абвастрэньне франка-германскіх адносін адбываецца якраз пры Папэне і Эрыё, тады, як першы даўно лічыцца прыхільнікам германа-францускага саюзу, а апошні рэкламуе сябе, як праваднік брыянайскай палітыкі.

Частка памяркоўных правых газэт вельмі не задаволена нядаўнім інтэрв'ю Рэхбэрга, данага ім у францускім друку, і патрабуе, каб урад выказаўся з поваду гэтага, бо Рэхбэрт у сваіх выступленьнях часта спасылаецца на Папэна.

***

ПАРЫЖ. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе: «Эрыё прыняў ангельскага пасла Ціроля. Пацьвярджаецца, што Эрыё паедзе ў Лёндан на 2 сутак 13 або 14 дня сустрэчы з Макданальдам».

ЗАБАСТОВАЧНЫЯ БАІ ГЕРМАНСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

БЭРЛІН. Забастовачная барацьба германскага пралетарыяту супроць спроб зьніжэньня зарплаты на аснове апошняга назвычайнага дэкрэту працягваецца.

У Мюнхене забаставалі рабочыя заводу «Байорышэ Мотэрэн Вэрке», на якім вырабляюцца, галоўным чынам, авіяцыйныя маторы. Забаставалі таксама рабочыя кабэльнага заводу ў Дуісбургу (Рурская вобласьць) і рабочыя цэлага раду прадпрыемстваў у Саксоніі. «Бэрлінэр Бэрзэн Цэйтунг» канстатуе, што ў разультаце кампаніі, якая праводзіцца рэвалюцыйнай прафпазыцыяй і кампартыяй, у раёне Хэмніц-Цьвікаў забаставалі рабочыя на перапрадзільнай фабрыцы «Віт», а таксама тэкстыльных фабрык «Гофман» і «Мэлер унд Горн».

Газэта адначасова падкрэсьлівае, што на радзе іншых прадпрыемстваў пад націскам забастовак, або адных толькі пагроз абвясьціць забастоўку, прадпрыемцы адмовіліся ад зьніжэньня зарплаты.

Рэфармісцкія прафбюракраты ўсё больш адкрыта сабатуюць забастовачную барацьбу. Намаганьнямі прафбюракратаў сарвана 5-дзённая забастоўка друкарскіх рабочых у Дусэльдорфе.

СПРАВА СУПРОЦЬ УРАДУ ПАПЭНА

БЭРЛІН, 12. (ТАСС). У верхсудзе ў Лейпцыгу пачаўся разгляд справы, узбуджанай адхіленымі 20 ліпеня прускімі міністрамі, супроць ураду Папэна аб законнасьці дзеяньняў ураду. Да скаргі прускіх міністраў далучыліся, як вядома сацыял-дэмакратычная фракцыя прускага ландтагу, а таксама ўрады Баварыі і Бадэну.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ

ВАРШАВА, 12. (ТАСС). У сувязі з забастоўкай рабочых на варшаўскім газавым заводзе, палітычная паліцыя ў Варшаве зрабіла масавыя аблавы і вобыскі сярод асоб, западозраных у камуністычнай дзейнасьці. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў падтрыманьні забастоўкі і падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 15-й гадавіны Кастрычніка.

ЗАБАСТОУКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ВАРШАВА, 12. (ТАСС). Забастоўка рабочых варшаўскага газавага заводу, якая працягваецца шосты дзень, абвастраецца.

Да работы на газавым заводзе прыцягнуты войскі. Паведамляюць аб вялізарных стратах, псаваньні абсталяваньня і няшчасных выпадках, выкліканых некваліфікаваным абслугоўваньнем скаладаных машын салдатамі.

Улады імкнуцца ліквідаваць забастоўку, шляхам вынясеньня ўрадавай арбітражнай пастановы. У міністэрстве працы адбылася нарада пры ўдзеле прадстаўнікоў фашысцкіх прафбюракратаў магістрату.

***

ПАРЫЖ, 11 (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Гавас з Бухарэсту, у бухарэсцкіх добра па інфармаваных колах даюць разумець, што румынскі ўрад папросіць Тытулеску ўзяць на сябе кіраўніцтва замежнай палітыкай пры ўмове, калі ён будзе дзейнічаць у поўнай згодзе з румынскімі саюзьнікамі ў адносінах пакту ненападу па СССР і аднаўленьня перагавораў з Літвінавым, намечаных на 17 кастрычніка. У выпадку, калі разгалосьсі па гэтым пытаньні паміж урадам і Тытулеску будуць працягвацца, супрацоўніцтва паміж Бухарэстам і Тытулеску, як указваюць, будзе лічыцца немагчымым.

ПАД НОСАМ ПАЛІЦЫІ

ГЕЛЬСІНГФОРС, 12. (ТАСС). Як паведамляюць газэты, у Гельсінгфорсе выкрыта мапэньніцкая арганізацыя. Яна займалася шантажом рабочых і сялян, якія імкнуліся перабрацца ў Савецкі саюз. Эксплёатуючы цягу фінскіх працоўных у СССР, шайка займалася вярбоўкай перабежчыкаў, абіраючы і апукваючы іх. Тыя, што жадалі адправіцца ў СССР, павінны былі ўплачваць у сярэднім 500 фінскіх марак. Грошы прысвойваліся. Усе, хто зварачаўся да гэтай арганізацыі і ўплачваў грошы, у СССР ня былі перавезены. Машэньнікам удалося ашукаць ня менш 100 чалавек. Цікава адзначыць, што шайка дзейнічала доўгі час амаль адкрыта, пад носам паліцыі.

ПОСЬПЕХ КАМУНІСТАЎ НА ВЫБАРАХ У ІНДЫІ

ПАРЫЖ, 12. (ТАСС). Як паведамляюць з Індыі, камуністы атрымалі буйны посьпех на выбарах у органы мясцовага кіраўніцтва. У горных і будаўнічых раёнах камуністы атрымалі тры месцы, у цэнтральным «стычнай» партыі. У раёне Бэнарэса камуністы атрымалі тры месца, у цэнтральным раёне — 10 месц, тады як раней яны тут ня мелі ні аднаго месца. Усяго камуністы атрымалі 60 месц, супроць 22 у 1926 годзе.

ПРЫЕЗД САВЕЦКАГА ВУЧОНАГА У ВАРШАВУ

ВАРШАВА, 12. (ТАСС). У пасольстве СССР адбыўся прыём у гонар прыехаўшага вядомага савецкага вучонага Плятнёва. На прыёме прысутнічалі буйнейшыя прадстаўнікі польскіх мэдыцынскіх колаў. Міністэрства замежных спраў было прадстаўлена дырэктарам усходняга дэпартаманту Шэтцэлем. Прысутныя віталі Плятнёва ў сувязі з 35-годзьдзем яго мэдыцынскай навуковай дзейнасьці. У часе прыёму адбылася гутарка Плятнёва з прысутнымі на тэму аб разьвіцьці савецкай мэдыцыны.

БЯСКОНЦЫЯ ДАКЛАДЫ...

ЖЭНЭВА, 12. (ТАСС), 10 і 11 кастрычніка адбываліся пасяджэньні пленуму Лігі нацый, на якіх абмяркоўваліся даклады, выпрацаваныя камісіяй. Пленум «прапусьціў» даклады аб «паспрадзіцтве Лігі нацый у справе міру», аб міжнародным бюро і г. д. Прынят таксама даклад 6-й камісіі, зроблены на эўрапэйскай камісіі з рэзалюцыяй аб падаўжэньня яе паўнамоцтваў. Пленум разам з радам іншых пытаньняў, як абарона дзіцячай працы, барацьба з гандлем жывым таварам, займаўся пытаньнем аб «супрацоўніцтве друку ў справе міру», а таксама заслухаў даклад аб становішчы нацыянальных меншасьцяй.

КРЫЗІС КРОЧЫЦЬ...

БЭРЛІН, 12. (ТАСС). Апублікавана справаздача германскага «сталёвага трэсту» аб выніках гаспадарчага году, які закончыўся 1 кастрычніка.

Гэта справаздача зьяўляецца яркім паказальнікам далейшага паглыбленьня эканамічнага крызісу ў Германіі. Прадукцыя «Стальнога трэсту» ў 1931-32 годзе параўнальна з 1930-31 годам зьнізілася па здабычы вугалю з 17,3 мільёнаў тон да 14,28 млн. тон, па коксу —7,66 млн. тон да 3,06 млн. тон, па выплаўцы чыгуну — з 3,28 млн. тон да 2,19 млн. тон і па выплаўцы сталі з 3,9 млн. тон да 2,19 млн. Зварот трэсту склаў у бягучым годзе 522,6 млн. марак, супроць 849.1 млн. марак у 1930-32 г. Да 30 верасьня 1932 году на прадпрыемствах трэсту было занята ўсяго 81.668 рабочых, супроць 97,012 чал. год таму назад.

ДЭМАГАГІЧНЫ МАНЭЎР

БЭРЛІН, 12. (ТАСС). 11 кастрычніка адбылося пасяджэньне камісіі па замежных справах германскага рэйхстагу, скліканае ў рэзультаце шматлікіх патрабаваньняў камфракцыі. **Урад адмовіўся паслаць сваіх прадстаўнікоў на пасяджэньне.**

На парадку дня пасяджэньня камісіі стаялі пытаньні аб Лёнданскай канфэрэнцыі, аб разьбраеньні і г. д. З прычыны адсутнасьці прадстаўнікоў ураду камісія пастанавіла ўстрымацца ад абмеркаваньня гэтых пытаньняў. Прадстаўнікі камфракцыі ўнесьлі прапанову аб тым, каб камісія пераканструявалася ў сьледчую камісію, бо сьледчая камісія, згодна канстытуцыі мае паўнамоцтвы ў прымусовым парадку забясьпечыць прысутнасьць прадстаўнікоў ураду. Аднак, гэта прапанова была адхілена большасьцю камісіі, якія імкнуліся ўнікнуць новага канфлікту з урадам.

Супроць камуністычнай прапановы галасавалі таксама ня толькі прадстаўнікі Баварскай народнай партыі, ня гледзячы на сваю «апазыцыйную» фразэалёгію, але і нацыянал - сацыялісты. Сацыял-дэмакраты ад галасаваньня ўстрымаліся.

Перад тварам гэтага факту яўна дэмагагічным перадвыбарчым манэўрам зьяўляецца прыняцьце большасьцю камісіі рэзалюцыі, у якой заяўляецца, што факт адмаўленьня ўраду прыслаць сваіх прадстаўнікоў на пасяджэньне камісіі ёсьць парушэньне канстытуцыі і што гэтым пытаньнем павінен будзе заняцца новы рэйхстаг.

АБ ПЛЯНЕ ЯРАВОЙ СЯЎБЫ Ў 1933 ГОДЗЕ

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

1. Прыняць прапанаваны Наркамземам Саюзу ССР плян яравой сяўбы ў 1933 годзе (У тыс. га)

Рэспублікі, краі і вобласьці	У тым ліку: Увесь пасеў	Пшаніца	Авёс	Ячмень
Паўночны край	810	28	335	145
Карэлія	57		26	7
Ленінградская вобласьць	1575	20	445	138
Заходняя вобласьць	3400	65	865	160
Маскоўская „	4045	20	1325	49
Іваноўская „	1592	34	560	51
Горкаўскі край	3835	125	1880	245
ЦЧВ	7214	460	1550	173
Урал	6053	2480	1400	320
Башкірыя	2430	970	600	15
Татарыя	1930	270	600	25
Сярэдняя Волга	7400	2950	1100	45
Ніжняя Волга	6859	3730	480	190
Паўночны Каўказ (уключаючы Дагестан)	8750	2200	356	900
Крым	475	—	58	180
Казакстан	5115	2350	293	154
Кара-Калпакія	109	2	—	1
Заходняя Сібір	7000	4000	1300	110
Усходняя Сібір	1929	720	500	120

Рэспублікі, краі і вобласьці	У тым ліку: Увесь пасеў	Пшаніца	Авёс	Ячмень
Якуція	73	15	10	17
Далёка-Ўсходні край	1050	450	300	2[illegible]
УССР	17600	1500	1950	3250
БССР	2680	100	625	28[illegible]
ЗСФСР	1444	231	10	22[illegible]
УзбССР	2180	570	—	22[illegible]
ТаджССР	570	300	—	10[illegible]
ТуркССР	354	65	—	2[illegible]
Кіргізія	980	445	75	14[illegible]
Разам	97500	24100	16643	727[illegible]

2. Даручыць Наркамзему Саюзу ССР, па ўзгадненьні з краямі, вобласьцямі і рэспублікамі, у дзнадны тэрмін зацьвердзіць плян пасеву па іншых культурах.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР П. КЕРЖАНЦАЎ.

Масква, Крэмль, 9 кастрычніка 1932 г. № 1.550.

Агітмасам ГК і РК КП(б)Б і ячэек, гарадзкім і раённым камісіям сьвяткаваньня 15-й гадавіны Кастрычніка, загадчыкам радыёвузлоў

16-га кастрычніка, а дзевятай гадзіне ўвечары арганізуйце масавае слуханьне ўсебеларускай радыё-перакліч аб падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 15-й гадавіны Кастрычніка. Будуць дакладваць аб ходзе падрыхтоўкі старшыні райкамісій Віцебск, Гомель, Магілеў, Ворша, Дзяржынск, Бабруйск, Хойнікі, Дрыса, Асіпавічы, Рагачоў, Слуцак, Полацак. Праверце спраўнасьць прыёмнікаў.

Прысутнасьць членаў райкамісій абавязкова.

Нам. старшыні Цэнтральнай камісіі ЧАРНУШЭВІЧ.

Старшыня камітэту Радыёвяшчаньня ШУКЕВІЧ.

Пра фабрыку „Дзьвіна" будзе напісана ў гісторыі

ВІЦЕБСК, 8 (БелТА). Сакратарыят ІК напісаньні гісторыі фабрык і заводаў БССР пры Беларускай Акадэміі Навук уключыў фабрыку «Дзьвіна» ў лік тых прадпрыемстваў, гісторыі якіх павінны быць напісаны ў першую чаргу.

На фабрыцы створана рэдкалегія, якая занялася папярэднім зборам архіўных матар'ялаў, успамінаў і дакумантаў па гісторыі фабрыкі. Намячаецца правядзеньне нарадаў з старымі рабочымі, вечароў успамінаў і г. д.

Пасьля канчатковага збору матар'ялаў пры дапамозе брыгады БАН будзе прыступлена да складаньня канкрэтнага пляну практычнай работы па напісаньні кнігі.

Упакоўка яблык у саўгасе Адаменкі (Лёзьнянскі раён)

Паведамленьні

— 13 кастрычніка, у 12 гадз. раніцы, у памяшканьні агітмасавага аддзелу ЦК КП(б)Б (2-гі паверх, пакой № 39) адбудзецца пасяджэньне мастацкай падкамісіі цэнтральнай Кастрычніцкай камісіі. Абавязковая яўка наступных т. т.: Ашарові, Дунец, Галкін (або Матусаў) — Белдзяржкіно, Рудніцкі — Наркамасьветы, Башмачнікаў — гарком партыі, Вольскі (або Ліманоўскі) — БАН, прадстаўнік ЦК ЛКСМБ, Гальбург, Кіпніс, Мільчын, Сіліманў, Аўтуцыцяў, Гаўрыленка (мастакі).

— 13 кастрычніка, у 1 гадз. дня (памяшканьне ЦК, 2-гі паверх, габінэт т. Чарнушэвіча) склікаецца цэнтральная Кастрычніцкая камісія з наступным парадкам дня: 1) Даклад Наркамшляху і Бюро чытачнікаў (т. т. Эпле і Бэрнэр). 2) Паведамленьні ўпаўнаважанага Наркамцяжпраму і Наркамлёгпраму (т. т. Сакаленка і Грысевіч). 3) Даклады Гомелю і Менску (т. т. Камісэрчык і Башмачнікаў). Абавязковая яўка начальных т. т.: Плешакоў, Домбаль, Брагінскі, Душец, Рачыцкі, Бялуга, Кавальчук, Валодзька, Саевіч, Герповіч, Нескрашэвіч, Лынькоў, Башмачнікаў.

— 14-X, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні Ментаркому КП(б)Б (вул. К. Маркса, 14, пакой 32) адбудзецца інструкцыйная нарада для усіх прапагандыстаў партшкол г. Менску па пытаньні пастановы пленуму ЦК УсесКП. Яўка ўсіх прапагандыстаў абавязковая.

— **Разьвёрстка кампляктаваньня Менскага СГШ.** Партколектывы «Варашылава»—3 чал., «Камунар» — 2, «Бальшавік» — 4, «Масква» — 2, «Кастрычнік» — 5, штотачная — МРВ — 2, «Полымя рэвалюцыі» — 2, абутковая — 4, друкарня імя Сталіна — 3, хлебазавод — 2, шклозавод — 2, «Камунарка» — 2, Белдзяржбуд — 2, цягі — 2, харчавікоў — 2, ДЗФ — 2, Сувязь — 2, астатнія партколектывы і ячэйкі г. Менску камандыруюць у Менскую СПШ па таварышу.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. т. Бунеева Івана Уласава, Цугалова Піліпа Якаўлевіча (Жлобінск. арганізацыі), Прыката Г. М., Парфёнова А. І., Мінкевіча П. Я., Пажарыцкага Е. Д., Кубракова С. І. і Лідэрмана В. І., з'явіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б або паведаміць сваё месца жыхарства і работы — Менск, Савецкая, 55, 8-ці паверх, 18 пакой. Просьба да ўсіх партарганізацый, якія ведаюць месцазнаходжаньня памянёных таварышоў, паведаміць ПК ЦКК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

15-га КАСТРЫЧНІКА Г. Г. У ГОМЕЛІ
склікаецца
5 ПЛЕНУМ ЦК МОПР'у БССР
ПАРАДАК ДНЯ ПЛЕНУМУ:
1. 10-годзьдзе МОПР'у і задачы інтэрнацыянальнага выхаваньня—даклад тав. Домбаль.
2. Вынікі спаборніцтва—конкурсу МОПР-работы па БССР—даклад тав. Іткін.
На пленум павінны зьявіцца ўсе члены і кандыдаты ЦК МОПР'у БССР, члены рэвізійнай камісіі ЦК.
САКРАТАР ЦК МОПР'у БССР ІТКІН.

„ЧЫРВОНАЯ ЗЯРКА" Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30 Каса—а д 1 гадз. РЭЎНАСЬЦЬ драма ў 6 частк. Кіно-хроніка САЮЗКІНО.
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30 Дзенны с.—у 2 г. АДЗІНАЦЦАЦЬ ЧАРЦЕЙ Зьвыш праграмы—кіно-хроніка САЮЗКІНО.
Пралетары НАТЭЛА у гал. ролі Ната ВАЧНАДЗЭ Дзенныя дзіцячыя сэансы Сапраўдныя паляўнічыя
СПАРТАК Пач.: 7, 8-20, 9-40, 11. Каса—з 5 г. Новы замежны фільм Абшарпаныя ветразі КІНО-РАМАН у 8 частках.

Уваравіцкі аўта-трактарны тэхнікум абвяшчае, што прыём заяў на асенні набор працягнут да 25 кастрычніка.
Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-механікаў па рамонце.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам, як і ў іншых індустрыяльных і с.-г. тэхнікумах.
Адрас: ст. Уза, Зах. чыг. м. Уваравічы, аўта-трактарны тэхнікум.
Дырэкцыя тэхнікуму.

ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе дакумантаў у газ. „Зьвязда" НЯ ПРЫМАЮЦЦА

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ
АБВЯШЧАЕ
дадатковы набор студэнтаў
на 1 курс ін-ту на дзённыя аддзяленьні
1. Прамысловага будаўніцтва—50 чалавек.
2. Эканамічнае аддз.—25 чалавек.
Заявы з прыладжэньнем дакумантаў, згодна даведніку НКАСьветы БССР, прымаюцца да 25 кастрычніка г. г. у канцылярыі Інту: г. Менск, рог Універсытэцкай і Чырвонаармейскай вуліцы, дом № 42-8.
Усе паступаючыя павінны прайсьці праверачныя іспыты па матэматыцы, фізыцы, грамадзназнаўстве і беларускай мове у аб'ёме курсу Рабфаку.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Дрысенскі паліт асьветны тэхнікум
абвяшчае прыём студэнтаў на наступныя аддзяленьні: 1) масавае, 2) газетнае, 3) бібліятэчнае.
Тэхнікум рыхтуе кваліфікаваных кіраўнікоў культмасавых установаў.
Да заявы далучаюцца наступныя дакумэнты: аб узросьце (метрыка), аб асьвеце, аб стане здароўя, аб сац. і матар'яльн. становішчы паступаючага і яго бацькоў, анкета, засьведчаная праф. або савецкімі арганізацыямі, аб адносінах да вайсковай павінасьці і дзьве фота-карткі.
Прыём заяў працягнут да 20-X-32 г.
Для асоб, якія ня маюць адукацыі за 7-годку, будуць адкрыты падрыхтоўчыя курсы.
Студэнты будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам.
Адрас тэхнікуму: г. Дрыса. Дрысенскага раёну, БССР, Дрысенскі паліт асьветны тэхнікум.
Дырэктар п.-а тэхнікуму Шаленіна.

Лужасьнянскі дзяржаўны с.-г. ільнаканапляводчы тэхнікум
абвяшчае, што прыём заяў на 1-шы курс тэхнікуму працягнут да 1 лістапада. Прымаюцца асобы з ведамі 7 груп. а для скончыўшых 6 груп залічэньне на 1-шы курс праводзіцца пасьля 3-месячнай падрыхтоўкі пры тэхнікуме. Асобы, якія ня маюць адпаведнай адукацыі, для залічэньня на 1-шы курс павінны трымаць іспыты за 7 груп, а на 3-месячныя падрыхтоўчыя курсы—за 6 груп.
Заняткі з прынятымі на 1-шы курс і падрыхтоўчыя курсы пачынаюцца з 19 кастрычніка.
Прыём на 2-гі курс тэхнікуму з ведамі 8-9 груп працягнут да 1 лістапада.
Працягваецца прыём на 6-месячныя ільнаканапляводчыя курсы пры тэхнікуме з адукацыяй 5 груп, а пры навучаньні 2—3-гадовага ільнаводчага практычнага стажу—з 3—4 груп. Заняткі з прынятымі курсантамі пачынаюцца з 19 кастрычніка.
Усе залічаныя ў тэхнікум і на курсы забясьпечваюцца інтэрнатам, акрамя пасьцельных прылад. Скрадняя стыпэндыя па тэхнікуму—36 р., а для ільнаканапляводчых курсаў—50 руб. Пры тэхнікуме ёсьць сталоўка.
Адрас: г. Віцебск, (9 клм. па Градзэзкім шасэ), Лужасьнянскі тэхнікум.
Дырэктар Марозаў.

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян, якія маюць
ТАЛЁНЫ
на права індывідуальнага заказу
АБУТКУ ЦІ ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ,
ШТО ВЫДАНЫЯ ТАЛЁНЫ да 1-га кастрычніка
з 17 кастрычніка будуць лічыцца НЕСАПРАЎДНЫМІ.
Хадайніцтва аб працягненьні тэрміну ня будуць прымацца пад увагу.
БЕЛКААПСАЮЗ.

Апорны пункт па тэхнічнай прапагандзе пры Беларускім аўта-дарожным навучальным камбінаце
паведамляе, што ім праводзіцца, праз аўтадарожны габінэт пры Доме Тэхнікі (г. Менск, Камсамольская, 25, пакой 7)
ШЫРОКАЯ ЗАВОЧНАЯ і ВОЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ
для вынаходцаў, рацыяналізатараў, ударнікаў-рабочых, ІТР і студэнтаў па ўсіх тэхнічных і вытворчых пытаньнях аўта-дарожнай справы.
У кансультацыі прымаюць удзел прафэсарска настаўніцкія сілы аўта-дарожнага навучальнага камбінату (інстытут і тэхнікум), а таксама і іншых інстытутаў сыстэмы Цудэтрансу.
Па ўсіх пытаньнях зварачацца па вышэй паказаным адрасе па пошце або асабіста з 7 да 10 гадз.
Аўта-дарожны навучкамбінат.

Швэйная ф-ка імя „8-га сакавіка"
даводзіць да ведама ўсіх заказчыкаў, што ў інтарэсах выкананьня да Кастрычніцкіх урачыстасьцяй старых невыкананых заказаў, а таксама ўноў прынятых заказаў да 10 кастрычніка,
НЕАБХОДНА ЗЬВЯВІЦЦА НА ПРЫЁМАЧНЫЯ ПУНКТЫ ЗАКАЗАЎ
да 17 кастрычніка уключна для прымерак.
У выпадку няяўкі заказчыка да ўказанага тэрміну, выкананьне яго заказаў
будзе перанесена да канца IV кварталу г. г.
Дырэкцыя швэймай ф-кі „8 сакавіка".

15 кастрычніка 1932 году ў гор. Менску, у клюбе працасьветы, у 7 гадз. вечара адкрываецца
3-ці ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД т-ва „Прэч няпісьменнасьць" БССР.
Парадак дня зьезду наступны:
1) Справаздача Цэнтральнага савету за час з II-га зьезду і дальнейшыя задачы таварыства.
2) Аб задачах культурнага будаўніцтва і абавязковай ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.
3) Даклад цэнтральнай рэвізійнай камісіі.
4) Зацьвярджэньне новага праекту статуту т-ва „Прэч няпісьменнасьць" і палажэньне аб юрыдычным членстве.
5) Выбары.
Фракцыя зьезду адбудзецца там-жа, у 6 гадз. вечара.
Просьба да ўсіх дэлегатаў і запрошаных прадстаўнікоў зьявіцца своечасова.
Прэзыдыум ЦО Т-ва „Прэч няпісьменнасьць" БССР.

Менская мантажная кантора УЭА
з 1-га кастрычніка г. г.
вылучана ў самастойную міжраённую тэхнічную мантажную кантору
з раённым абслугоўваньнем:
Барысава, Слуцка, Бабруйска, Рагачова, Старых Дорог і інш.
За заключэньнем дагавораў на мантажныя работы і па іншых пытаньнях зьвяваных з мантажнымі работамі,
зварачацца непасрэдна ў Менскую міжраённую мантажную кантору.
Адрас: Менск, Савецкая 59, тэл. 17-44.
Тэл. адрас—Менск, мантажная кантора УЭА.
Разьлікоўны рахунак ва Ўсебеларускай Канторы Дзяржбанку № 40-4544.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Галоўлітбел 33